*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы*
*гуманітарнага ліцэя*

# Літаратура і мастацтва
# Сусветная гісторыя
# Геаграфія

Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

Навукова-творчы калектыў
«Беларуская школа – XXI стагоддзе»

# Літаратура і мастацтва
# Сусветная гісторыя
# Геаграфія

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя*

Выпуск пяты

Мінск
2018

УДК 37.01
ББК 74.26
Л64

**Літаратура** і мастацтва; Сусветная гісторыя; Геаграфія : эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя. — Мінск : Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы», 2018. — 92 с.

Л64

Зборнік аб'ядноўвае эксперыментальныя навучальныя праграмы курсаў па літаратуры і мастацтве; гісторыі Расіі ад пачаткаў да сённяшніх дзён; культурнай геаграфіі для гуманітарнага ліцэя з беларускай мовай навучання, складзеныя іх аўтарамі і выкладчыкамі.

Рэкамендуецца педагогам сярэдніх навучальных установаў гуманітарнага профілю.

**ББК 74.26**
**УДК 37.01**

© Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы», 2018.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Літаратура і мастацтва

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*
(2-гі год навучання, частка II)

Складальнік:
*Лявон Баршчэўскі,*
кандыдат філалагічных навук,

# УСТУП

Гэтая частка з'яўляецца дадаткам да Праграмы па дысцыпліне «Літаратура і мастацтва» для ІІ курса (9 класа) гуманітарнага ліцэя з беларускай мовай навучання, апублікаваным у 2017 г.[1]

У яе ўключаныя пытанні і заданні да адпаведных тэмаў і раздзелаў вышэйзгаданай праграмы, прызначаныя для лепшага засваення адпаведнага курса навучэнцамі. Падрыхтоўка гэтых пытанняў і заданняў грунтуецца на шматгадовым асабістым досведзе аўтара ў выкладанні гэтай дысцыпліны. Акрамя таго аўтарам выкарыстаныя матэрыялы з крыніц, пералік якіх падаецца ў канцы гэтай часткі праграмы.

## БЕЛАРУСКІЯ КРЫНІЦЫ МАСТАЦКІХ І ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАЎ, ШТО ВЫВУЧАЮЦЦА Ў КУРСЕ

*А) Выяўленчае мастацтва і архітэктура*

Архітэктура Беларусі: Энцыкл. даведнік / рэд. калегія: А. А. Воінаў, А. А. Дылейка, Я. М. Кавалеўскі і інш. Мн.: БелЭн, 1993.

Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і склад. Н. Ф. Высоцкая. Мн.: Беларусь, 1984.

Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў: фрэска, абраз, партрэт / склад. Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Карповіч, А. В. Аладава. Мн.: Беларусь, 1980.

---

[1] Гл.: Літаратура і мастацтва. Геаграфія. Беларускі фальклор. Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя. Вып. 4. Мн.: РГА ТБШ, 2017. С. 3–50.

Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. I: Першабытны лад – XVII стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2007.
Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. II: XVIII – пач. XXI ст. Мн.: Беларусь, 2007.
Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010.
Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII–XVIII стагоддзі. Мн.: Беларусь, 2010.
Луцкевіч Л. Вандроўкі па Вільні. Вільня: Рунь, 1998.
Мастацтва (Айчынная і сусветная мастацкая культура): вуч. дапам. для 5 класа (+CD) / аўтары: Грачова В. А., Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава, Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2016.
Мастацтва (Айчынная і сусветная мастацкая культура): вуч. дапам. для 6 класа (+CD) / аўтары: Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава, В. А. Грачова, А. А. Маруноў. Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2016.
Мастацтва (Айчынная і сусветная мастацкая культура): вуч. дапам. для 7 класа (+CD) / аўтары: Н. С. Валанцэвіч, С. І. Колбышава, Ю. Ю. Захарына і інш. Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2017.
Музей старажытнабеларускай культуры: альбом / склад. А. А. Ярашэвіч. Мн.: Беларусь, 2004.
Пластыка Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і склад. Н. Ф. Высоцкая. Мн.: Беларусь, 1983.
Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі ў 5 т. / рэдкалегія: І. П. Шамякін і інш. Мн.: БелСЭ, 1984–1987.
Vilnius – Вільня. Сталіца Літвы ў гісторыі Беларусі: набор паштовак; тэкст В. Корбута. Мн.: Рыфтур, 2015.

*Б) Музыка*

Бах І. (Ё.) С. Таката і фуга рэ мінор; Харальная прэлюдыя; Прэлюдыя і фуга до мінор // Арганы Беларусі. Полацкі Сафійскі сабор. Выканаўца: Ксенія Пагарэлая (CD). Мн.: ТАА «Новая музычная кампанія», 2008.
Вивальди А. «Четыре времени года». Запись из Минского костёла

св. Роха. Оркестр «Метаморфозы», дирижер П. Любомудров (CD). Мн.: Вігмагруп, 2016.

Лучшая классическая музыка (CD: №№ 003, 007, 013, 016, 032, 033, 034, 036, 042, 043, 044, 047, 050, 057, 061, 062, 067, 073, 077, 080, 081, 086, 087, 088, 092, 100). Мн.: ЧУП «Студия Столица», 2015.

Моцарт В. А. Канцэрт № 20 для фартэпіяна з аркестрам у выкананні Ігара Алоўнікава з сімфанічным аркестрам Белдзяржфілармоніі. Дырыжор – Аляксандр Анісімаў. *Рэжым доступу:* https://www.youtube.com/watch?v=UbNHAWM533A (12.01.2010 г.).

Музы Нясвіжа. Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі (CD). Мн.: Ковчег, [б. г.].

Музыка Беларусі XVI стагоддзя = Music of Belarus, 16$^{th}$ century. (2 CD. Тэкст В. У. Дадзіёмавай). Мн.: Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, 2011.

Музыка Беларусі XVII стагоддзя = Music of Belarus, 17$^{th}$ century. (2 CD. Тэкст В. У. Дадзіёмавай). Мн.: Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, 2011.

Музыка Беларусі XVIII стагоддзя = Music of Belarus, 18$^{th}$ century. (2 CD. Тэкст В. У. Дадзіёмавай). Мн.: Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, 2008.

Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл.: фонохрестоматия: 3 CD) / авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007.

*В) Літаратура (хрэстаматыі, анталогіі і зборнікі)*

Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1 / укл. А. Мальдзіса і інш. Мн.: Маст. літ., 1993.

Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / укл. А. І. Богдан; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2003.

Антычная літаратура ў беларускіх перакладах: Старажытная Грэцыя. Хрэстаматыя / склад. Д. М. Лебядзевіч. Гродна: ГрДУ, 2002.

Антычная літаратура ў беларускіх перакладах: Старажытны Рым. Хрэстаматыя / склад. Д. М. Лебядзевіч. Гродна: ГрДУ, 2003.

Багаславі сустрэчу мне… Выбр. лірыка паэтаў Плеяды / пер. і прадм. Н. Мацяш. Берасьце [б. в.], 2001.

Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. (Дадатак, с. 319–417).

Баршчэўскі Л. Словы і вобразы: літаратура і мастацтва ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Ч. 1: Ад пачаткаў да эпохі Адраджэння. Мн.: Зміцер Колас, 2017.

Беларуская літаратура XVIII – XIX стагоддзяў: Зб. тэкстаў / склад. М. В. Хаўстовіч. Мн.: БДУ, 2000.

Беларускія *Александрыя, Троя, Трышчан…* Перакладная белетрыстыка Беларусі XV–XVII стагоддзяў / укл. А. Бразгунова. Мн.: Бел. навука, 2009.

Беларускія летапісы і хронікі / укл. У. Арлова, прадм. В. Чамярыцкага. Мн.: Бел. кнігазбор, 1997.

Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст. / склад. М. Скобла. Мн.: Лімарыус, 2008.

І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016.

Кніга жыцій і хаджэнняў / укл. А. Мельнікава. Мн.: Маст. літ., 1994.

Літаратура народаў свету: Хрэст. для 10 кл. / укл. Л. П. Баршчэўскі. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995.

Літаратура XI–XVI стагоддзяў / нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012.

Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй школы / склад. М. А. Лазарук, Л. К. Цітова, В. У. Івашын. Мн.: Маст. літ., 1997.

Разанаў А. Кніга ўзнаўленняў. Мн.: Логвінаў, 2005.

Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI – XVIII стст. / укл., прадм. і камент. А. Бразгунова. Мн.: Бел. навука, 2011.

Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / укл. і пер. І. Саверчанкі. Мн.: Кнігазбор, 2007.

Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Т. 1: Ад вытокаў да пачатку XX стагоддзя / укл. А. А. Сабалеўскага. Мн.: Бел. навука, 1997.

Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995.

Яна і я. Вершы і песні пра каханне / склад. У. Сіўчыкаў, Р. Шастак. Мн.: Радыёла-плюс, 2005.

# ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

## УВОДЗІНЫ: ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА Ў ЖЫЦЦІ ЛЮДЗЕЙ

1. Раскрыйце сутнасць паняццяў «культура», «духоўная культура», «мастацтва», «літаратура» і іх узаемадзеянне.
2. Што такое мастацкі вобраз і мастацкі сімвал?
3. Назавіце асноўныя віды мастацтва, вызначце паслядоўнасць іх з'яўлення.
4. У чым палягае пазнавальны аспект мастацтва?
5. У чым вы бачыце аўтарскі пачатак у мастацтве?
6. Якім чынам, на вашу думку, суадносяцца мастацтва і іншыя формы грамадскай свядомасці.

## ТЭМА І. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАГА СВЕТУ

1. Ахарактарызуйце асноўныя асаблівасці мастацтва эпох палеаліту, мезаліту, бронзавага і жалезнага веку.
2. Уявіце сабе людзей, якія стваралі выявы першабытнага мастацтва. Якімі вы іх сабе ўяўляеце?
3. У чым палягае сінкрэтызм першабытнага мастацтва?
4. Што новага вы даведаліся пра характар жыцця першабытных людзей на тэрыторыі сучаснай Беларусі, пазнаёміўшыся з творам Міхася Чарняўскага «Вогнепаклоннікі»?

## ТЭМА II. ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ

1. Якім вам уяўляецца працэс узнікнення мастацтваў і літаратуры найстаражытнейшых цывілізацый: Міжрэчча, Егіпта, Індыі, Кітая?
2. Якім чынам суадносяцца між сабою мастацтва, літаратура і міфалогія.
3. У старажытнасці егіпецкія піраміды называлі словам «мер» («месца ўзнясення»). Якім чынам іх пабудова была звязаная з культам Сонца?
4. Як вы патлумачыце сэнс вядомай арабскай прыказкі: «Усё на свеце баіцца часу, а свет баіцца пірамід»?
5. Прачытайце егіпецкі гімн «Усхваленне Ніла», індыйскія гімны «Рыгведы» і апішыце акалічнасці ўзнікнення такіх твораў.
6. Старажытныя егіпцяне рабілі тэатралізаваныя паказы ў гонар бога Асірыса. У якой ступені яны суадносіліся з жыццём старажытнаегіпецкага грамадства?
7. Пра што расказваюць самыя старажытныя эпічныя творы (шумера-акадскі «Эпас пра Гільгамеша»)?
8. Чаму бюст царыцы Неферціці і сёння ўспрымаецца людзьмі як эталон выяўлення жаночай прыгажосці?
9. Чаму, на вашу думку, старажытнававілонскія зікураты маюць такія, ступеневыя, формы? Як яны суадносяцца з біблійным уяўленнем пра «Вавілонскую вежу»?
10. Што вам вядома пра мову і культуру старажытных індаеўрапейцаў-арыяў?

## ТЭМА III. АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРА

1. Чым адрозніваюцца сюжэты старажытнаегіпецкіх фрэсак і фрэсак палаца ў Кносе?
2. Падрыхтуйце прэзентацыю на тэму «Лабірынты Кноскага палаца».

3. Чаму знакамітая Львіная брама ў Мікенах можа сведчыць пра вялікую вынаходлівасць тамтэйшых дойлідаў?
4. Шмат якія старажытныя народы свету маюць багатую міфалогію. Чаму, на вашу думку, менавіта грэцкія міфы леглі ў падмурак еўрапейскай культуры?
5. Як асаблівасці грэцкай міфалогіі адлюстраваліся ў гамераўскім эпасе? Дайце жанравае вызначэнне паасобку «Іліяды» і «Адысеі».
6. Як складалася сістэма ордараў у старагрэцкай архітэктуры. Назавіце асноўныя элементы грэцкага ордара.
7. Якім чынам старагрэцкія скульптары спасцігалі таямніцы чалавечага цела? Якім вам уяўляецца гэты працэс? Ахарактарызуйце ўяўленне грэкаў пра ідэал прыгажосці на прыкладзе адной са скульптур.
8. У чым палягае, на вашу думку, мастацкае і канкрэтна-гістарычнае значэнне грэцкага вазапісу?
9. Жыхары Афінаў пакінулі сапраўдныя шэдэўры-творы мастацтва ў розных жанрах. Чаму на іх фоне вельмі непрыкметным выглядае мастацтва Старажытнай Спарты?
10. Ахарактарызуйце адзін з «цудаў старажытнага свету» (на выбар).
11. Якім чынам узнікалі старагрэцкая музыка і паэзія і як гэтыя працэсы звязаныя паміж сабою? Чым грэцкая музыка адметная ў параўнанні з пазнейшай класічнай музыкай?
12. У чым творчасць паэткі Сапфо можа прывабліваць сучаснага чытача?
13. Як узнік старагрэцкі тэатр? Апішыце гэты працэс.
14. Чаму, на вашу думку, старажытныя грэкі аддавалі перавагу – наведванню храма або наведванню тэатра?
15. Як выглядаў грэцкі амфітэатр? Якія пабудовы былі ў ім абавязковыя?
16. Якая была тыповая структура старагрэцкай трагедыі?

17. На падставе прачытанай трагедыі «Антыгона» Сафокла ахарактарызуйце паняцце катарсісу.
18. Які выбар вымушаны рабіць галоўныя героі трагедыі «Антыгона»? Дайце падрабязную характарыстыку аднаго (на выбар) з герояў гэтай трагедыі.
19. Што новага ўнёс у грэцкую трагедыю Эўрыпід? Растлумачце гэта на падставе прачытанай трагедыі «Медэя».
20. Якой тэматыцы былі прысвечаныя старагрэцкія і рымскія камедыі? Ахарактарызуйце на падставе камедыі Арыстафана «Жабы» асаблівасці гэтага жанру.
21. Хто перамог у паэтычнай спрэчцы герояў камедыі «Жабы» – Эсхіл або Эўрыпід?
22. Якое значэнне мае творчасць Арыстотэля для сучаснай філасофіі мастацтва і літаратуразнаўства?
23. Чаму рымскае мастацтва грунтавалася на грэцкай міфалогіі? Якое значэнне мелі грэцкія ўзоры мастацтва для старажытных рымлян?
24. У чым можна бачыць адметнасць дойлідства Старажытнага Рыма ў параўнанні з грэцкай архітэктурай?
25. Чаму рымскія скульптары ахвотна стваралі конныя статуі?
26. У якіх жанрах плённа тварылі рымскія літаратары? Чаму першае стагоддзе да н. э. называюць «часам вялікіх рымскіх паэтаў»?
27. У чым вы бачыце адрозненне аўтарскага «я», калі параўноўваць гамераўскі эпас з «Энеідай» Вергілія?
28. Што вы можаце сказаць пра асаблівасці лірычнай паэзіі Катула ў параўнанні з творчасцю Сапфо?
29. На прыкладзе твораў Гарацыя ахарактарызуйце асаблівасці жанру антычнай оды.
30. Растлумачце радкі з верша Алеся Салаўя: «Калі ж яшчэ нясказанае скажа // Цяпершчыны Гамер або Сакрат?

## ТЭМА IV. БІБЛІЯ ЯК ПОМНІК СТАРАЖЫТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Што вы можаце сказаць пра гісторыю ўзнікнення Бібліі і яе сувязь з вераваннямі і культурай старажытных юдэяў?
2. Чаму Біблію называюць, побач з антычнымі мастацтвам і літаратурай, адной з галоўных вытокаў пазнейшых новаеўрапейскіх і амерыканскіх мастацтва і літаратуры?
3. Якія нормы маральных паводзінаў чалавека прапаведуюцца ў Бібліі? Ці ёсць розніца ў трактоўцы гэтых нормаў у старым і Новым Запаветах?
4. Як кампазіцыйна пабудавана Біблія? На якіх мовах ствараліся яе паасобныя часткі?
5. Як развіваецца сюжэт стварэння свету Богам у першай кнізе Быцця (Роду)? Чаму чалавек з’яўляецца толькі ў канцы?
6. Якімі гаспадарамі свету аказаліся створаныя Богам людзі? Прывядзіце прыклады розных уплываў чалавека на ягонае акружэнне.
7. Як можна разумець вобраз дзяўчыны ў Найвышэйшай Песні Саламонавай?
8. Чаму і як вучыць Эклезіяст? Што такое біблійная алегорыя?
9. Як узнікненне прыпавесці звязана з узнікненнем Бібліі? Наколькі запатрабаваны жанр прыпавесці ў пазнейшай літаратуры?
10. Вытлумачце радок з верша сучаснага паэта Сяргея Законнікава: «Толькі свецяцца сумныя вочы Бога».

## ТЭМА V. З ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА СЯРЭДНЯВЕЧНАГА УСХОДУ

1. Раскажыце пра гістарычныя абставіны ўзнікнення і ўмацавання монатэістычных рэлігій у розных рэгіёнах Азіі.
2. Як гэтыя абставіны ўплывалі на характар развіцця культур адпаведных краін і імперый?

3. Назавіце вядомыя вам помнікі архітэктуры сярэднявечнай Персіі. У чым выяўляюцца найважнейшыя асаблівасці мусульманскіх храмаў-мячэцяў?
4. У якіх жанрах тварылі паэты ісламскага Усходу?
5. Дайце характарыстыку жанру рубаі.
6. Хто такі Умар Хаям і ў якіх сферах дзейнасці ён здабыў сабе славу? Якім ён паказаны на сучасным помніку ў іранскім Нішапуры?
7. Што вы можаце сказаць наконт праблематыкі рубаі Умара Хаяма? Якія вобразы найчасцей паўстаюць у гэтых творах і як іх можа ўспрымаць сучасны чытач?
8. У чым, на вашу думку, палягае сакрэт папулярнасці рубаі Умара Хаяма ў Еўропе, пачынаючы ад XVIII стагоддзя?
9. Прачытайце верш Рыгора Крушыны «Рубаі». Ці сапраўды гэты верш можна строга аднесці да названага жанру? Чаму, на вашу думку, верш усё ж такі мае гэткую назву?

## ТЭМА VI. ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА СЯРЭДНЯВЕЧЧА Ў ЕЎРОПЕ

1. Патлумачце, чаму часта кажуць, што сярэднявечная культура мае ўніверсальны характар?
2. Што ляжала ў падмурку светаўспрымання чалавека і на чым грунтавалася філасофія Сярэднявечча? Якім прыметнікам можна ахарактарызаваць светапогляд тыповага сярэднявечнага чалавека?
3. Чаму менавіта манастыры (кляштары) і храмы сталі найважнейшымі цэнтрамі культуры ранняга Сярэднявечча? Якія яшчэ асяродкі культуры гэтай эпохі сталі ўзнікаць пазней і з чым гэта было звязана? Чаму ў Візантыі размоўнай мовай была ў асноўным грэцкая, а мовай законаў – лаціна?
4. У якіх сферах жыцця мацней выяўляў сябе ўплыў старагрэцкай культуры, у якіх – уплыў хрысціянскай рэлігіі, а ў якіх – рымскіх традыцый?

5. У Візантыі склаўся тып крыжова-купальнага храма. Ахарактарызуйце яго.
6. Чаму ў аздабленні візантыйскіх і раннярускіх цэркваў актыўна выкарыстоўваліся мазаіка, фрэскі, мармур, а ў інтэр’ерах заходніх касцёлаў цэнтральнае месца займала скульптурнае распяцце?
7. Чаму ў гарадах Кіеве, Ноўгарадзе, Полацку былі збудаваныя аднатыпныя ў сваёй сутнасці Сафійскія саборы?
8. Якія жанры музыкі і рэлігійнай паэзіі ўзніклі ў Візантыі і які быў лёс гэтых жанраў на землях пазнейшых Украіны, Беларусі, Расіі?
9. Што такое «грыгарыянскія харалы» і як яны паўплывалі на станаўленне еўрапейскай класічнай музыкі?
10. Чым адрозніваецца абраз (ікона) ад карціны, напісанай на біблійны сюжэт? Што такое візантыйскі іканапісны канон?
11. Якое ўражанне на вас робяць раманскія пабудовы і якія – архітэктурныя ўзоры готыкі? Патлумачце розніцу.
12. Чаму, на вашу думку, Сярэднявечча называюць «часам кафедральных сабораў»?
13. Якія вы ведаеце найважнейшыя жанры хрысціянскай рэлігійнай літаратуры па асобных родах?
14. Чаму малітвы і казані (пропаведзі) былі самымі папулярнымі жанрамі хрысціянскай лірыкі?
15. У чым найбольш выявілася адметнасць прамоўніцка-паэтычнага таленту Яана Залатавуснага і Кірыла Тураўскага?
16. Параўнайце змест і стыль «Лаўсаіка» Паладыя Эленапольскага і ананімнага «Жыція Еўфрасінні Полацкай». У чым вы бачыце падабенства і розніцу? Прыкметы якіх жанраў можна адначасова заўважыць у тэксце беларускага твора?
17. Ахарактарызуйце асаблівасці сярэднявечнай рэлігійнай містэрыі. У якім выглядзе гэтыя містэрыі адлюстраваліся ў беларускім фальклоры? У чым палягала адрозненне ў стаўленні да тэатральных дзействаў каталіцкіх і праваслаўных іерархаў?

18. Як і дзе фарміраваліся свецкія жанры мастацтваў і літаратуры? Якую ролю ў гэтым адыгрывалі каралеўскія і князкія двары? Рыцарскія замкі?
19. Якое месца ў гісторыі беларускай культуры займаюць летапісы? Якія сярод іх, на вашу думку, маюць найбольшае літаратурнае значэнне?
20. Якія этапы можна вылучыць у станаўленні гераічнага свецкага эпасу?
21. На падставе прачытаных твораў параўнайце геройскія ўчынкі Бэўвульфа, рыцара Раланда і князя Ігара.
22. У чым палягае пафас «Слова пра паход Ігаравы», як у ім адлюстраваныя беларускія рэаліі і якія праблемы часавай лакалізацыі і інтэрпрэтацыі гэтага твора існуюць па сённяшні дзень?
23. Якім чынам сярэднявечны гераічны эпас паўплываў на станаўленне куртуазнай літаратуры і, у прыватнасці, рыцарскага рамана. Якія сюжэты рыцарскіх раманаў (аповесцяў) былі найбольш распаўсюджанымі?
24. Раскажыце пра змест і асаблівасці беларускай «Аповесці аб Трышчане».
25. Як называліся ў розных краінах стваральнікі куртуазнай паэзіі? Якія жанры існавалі ў гэтай паэзіі і як яна была звязана з музыкай?
26. Што такое «карнавальная культура»? Раскажыце пра асяродкі і асаблівасці яе развіцця? Патлумачце паняцце «гістрыён».
27. Апішыце ўражанне, якое зрабіў на Максіма Багдановіча выгляд касцёла св. Ганны ў Вільні. Калі магчыма, параўнайце яго са сваім уражаннем.
28. Падрыхтуйце паведамленне або прэзентацыю на тэму «Гісторыя кахання ў сусветнай літаратуры і мастацтве да рэнесансавага часу».

# ТЭМЫ VII і VIII. ЭПОХА РЭНЕСАНСУ: ПРОТАРЭНЕСАНС, РАННЯЕ, ВЫСОКАЕ І ПОЗНЯЕ АДРАДЖЭННЕ

1. Якімі былі сацыяльна-эканамічныя і духоўныя прычыны распаўсюджвання рэнесансавых ідэй?
2. Што адрознівала чалавека рэнесансавага светапогляду ад асноўнай масы людзей-сучаснікаў? Растлумачце сутнасць паняцця «гуманізм».
3. Якія перадумовы пашырэння рэнесансавай культуры ўзніклі ўжо ў эпоху Протарэнесансу? Якім чынам ішло вызваленне мастацтваў і літаратуры ад сярэднявечных канонаў?
4. У якім храналагічным парадку рэнесансавыя ідэі пашыраліся ў розных краінах і рэгіёнах Еўропы? Чаму гэтыя ідэі знайшлі толькі слабы адбітак у такіх краінах, як Маскоўская Русь, Сербія, Балгарыя або Грэцыя?
5. Як вы можаце растлумачыць паняцце «тытаны Адраджэння»?
6. Што незвычайнае, дагэтуль нябачанае з'явілася ў шэдэўрах італьянскіх майстроў выяўленчага мастацтва і архітэктуры ранняга і высокага Адраджэння? У чым па сёння гледачы бачаць загадкі «Моны Лізы» Леанарда да Вінчы або «Сікстынскай мадонны» Рафаэля?
7. Што вы можаце сказаць пра гісторыю стварэння «Давіда» Мікельанджэла? Чаму скульптура, першапачаткова прызначаная для сабора, была ўстаноўленая на плошчы перад палацам урада Фларэнцыі?
8. Героі карцін мастакоў Паўночнага Адраджэння найчасцей – простыя людзі, не арыстакраты. Як вы можаце патлумачыць гэтую з'яву? Рэнесансу? Хто былі асноўныя заказчыкі, стваральнікі і выканаўцы такой музыкі? Якімі былі далейшыя тэндэнцыі развіцця рэлігійнай музыкі, з чым яны былі звязаныя? Як развівалася мастацтва танца?
9. Чым можна растлумачыць уздым свецкай музыкі ў часы Рэ-

несансу? Якімі шляхамі ішло развіццё царкоўнай і свецкай музыкі ў Італіі, Нідэрландах, Францыі, Польшчы, Вялікім Княстве Літоўскім?

10. Якімі шляхамі ў эпоху Адраджэння працягвала развівацца народная карнавальная культура? Патлумачце сутнасць жанру фарса. У якіх жанрах развівалася гарадская сатырычная літаратура?
11. Апішыце феномен асаблівай папулярнасці тэатральнай культуры ў Англіі.
12. Калі і пры якіх абставінах рэнесансавая культура распаўсюдзілася ў Вялікім Княстве Літоўскім? Як гэта адлюстравалася ў розных відах мастацтва: у жывапісе, кніжнай графіцы, архітэктуры, музыцы?
13. У чым выяўляецца гуманізм літаратурнай творчасці такіх розных асоб, як Франчэска Петрарка, Дантэ, Франсуа Рабле, Эразм Ратэрдамскі, Мікола Гусоўскі, Францыск Скарына, Ян Каханоўскі, Сервантэс, Шэкспір?
14. Што вы можаце сказаць пра асаблівасці санета як паэтычнага жанру (на аснове прачытаных твораў Петраркі)?
15. Пачаткі якой паэзіі можна ўбачыць у творчасці Франсуа Віёна?
16. Якую эстэтычную праграму адстойвалі французскія паэты «Плеяды» і як гэта ўвасобілася ў творах П'ера дэ Рансара і Жаашэна Дзю Бэле?
17. Як развіццё рэнесансавай літаратуры звязана з ідэямі Рэфармацыі? Якія асаблівасці гэты працэс меў у ВКЛ і Польшчы?
18. Чаму існуюць усе падставы лічыць «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага часткай нашага нацыянальнага літаратурнага эпасу? Што і каго ўвасабляе вобраз зубра ў паэме? Якія гуманістычныя хрысціянскія ідэі выказвае тут аўтар? Параўнайце паказ вобраза князя Вітаўта ў ананімнай летапіснай «Пахвале Вітаўту» і ў «песні пра зубра». Раскажыце пра

месца і значэнне лацінскай мовы ў літаратуры Сярэднявечча і Рэнесансу.

19. Чаму цікавасць тытанаў Адраджэння эвалюцыянавала ў бок сваіх нацыянальных мовах. Патлумачце моўны выбар Скарыны.
20. У чым палягае літаратурна-мастацкае значэнне прадмоў і пасляслоўяў Скарыны? Дайце разгорнуты адказ або падрыхтуйце рэферат (прэзентацыю) на гэтую тэму.
21. У якой ступені Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага можна разглядаць як прадаўжальнікаў справы Скарыны?
22. З чым звязана ўзмацненне ролі польскай мовы ў станаўленні літаратуры Адраджэння ў ВКЛ? Чаму менавіта на польскай, а таксама і на лацінскай мовах быў створаны гераічны паэтычны эпас ВКЛ?
23. Раскажыце пра асноўныя творы Андрэя Рымшы і яго месца ў літаратуры ВКЛ. Якую ролю ён адыграў у станаўленні панегірычнай і гераічна-эпічнай паэзіі?
24. Ахарактарызуйце паняцце «рэнесансавага рэалізму» ў кантэксце творчасці Рабле, Сервантэса, Шэкспіра.
25. Якім чынам выяўляецца майстэрства Сервантэса-празаіка ў яго навелах? У рамане «Дон Кіхот»? Якое месца іроніі і гратэску ў гэтых творах?
26. Ахарактарызуйце глыбінныя прычыны з'яўлення ў англійскай літаратуры феномена Шэкспіра.
27. Апішыце асноўныя этапы творчасці Шэкспіра, яго эвалюцыю ў бок пострэнесансавых ідэй.
28. Чаму галоўны герой трагедыі «Гамлет» вагаецца ў сваім выбары?
29. Што яднае і адрознівае Сервантэса і Шэкспіра?
30. Зрабіце паведамленне на тэму: «Шэкспіраўскае пытанне «быць ці не быць» і праблема чалавечага выбару ў сучаснай яму і пазнейшай літаратуры».
31. Ахарактарызуйце асаблівасці санетнай творчасці Шэкспіра.

32. У якіх творах беларускай літаратуры або мастацтва найбольш усебакова адлюстраваны вобраз Францішка Скарыны? Зрабіце на гэтую тэму рэферат або прэзентацыю.

## ТЭМА IX. ПОСТРЭНЕСАНС: БАРОКА І КЛАСІЦЫЗМ У ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВЕ

1. Чаму ідэі Рэнесансу не атрымалі ў тую эпоху паўсюднага і безумоўнага пашырэння? Якія былі палітычныя і сацыяльна-эканамічныя прычыны гэтага? Якую ролю ў гэтым адыграла Контррэфармацыя?
2. Што такое маньерызм?
3. Што стала фонам узнікнення мастацкай плыні барока? Што такое «барочны светапогляд»? Якія рысы барочнай эстэтыкі з’яўляюцца найбольш выразнымі? Што майстры барока запазычылі ў маньерызму?
4. Якія вы можаце назваць асаблівасці барочнай архітэктуры? Барочнага жывапісу? Барочнай музыкі? Тэатра «камедыя дэль артэ»?
5. Зрабіце прэзентацыю на тэму «Святлацень у жывапісе майстроў барока».
6. У якім кірунку развівалася барочная кніжная графіка на Захадзе і ў ВКЛ?
7. Чаму Ё. С. Бах лічыцца геніем паліфаніі ў музыцы? Якія пачуцці выклікае ў вас музыка А. Вівальдзі?
8. Раскажыце ў агульных рысах гісторыю ўзнікнення опернага і балетнага мастацтва.
9. У творчасці якіх кампазітараў музычная паліфанія дасягнула сваіх вяршыняў?
10. Якія матывы і вобразы былі характэрныя для творчасці паэтаў-метафізікаў у Англіі? Для паэмы Джона Мілтана «Страчаны рай»?
11. У якой ступені барока атрымала распаўсюджанне ў ВКЛ? Што спрыяла гэтаму і якія перашкоды стаялі на шляху

развіцця культуры ў гэтую эпоху? Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя помнікі традыцыйнага барока ў беларускім дойлідстве, жывапісе, музыцы.

12. Ахарактарызуйце ролю езуітаў у пашырэнні новага мастацтва і літаратуры ў ВКЛ.
13. Якім чынам барочны светапогляд адлюстраваўся ў беларускім народным тэатры батлейкі?
14. Дайце характарыстыку асноўным жанрам і напрамкам рэлігійна-палемічнай літаратуры ў ВКЛ у кантэксце контррэфармацыйных рухаў.
15. Што служыла падмуркам развіцця беларускай літаратуры «высокага» барока? Якую ролю ў гэтым адыгралі Сімяон Полацкі і «полацкая школа паэзіі»? Ахарактарызуйце паэтычную творчасць Сімяона Полацкага з гледзішча моў і жанраў, у якіх ён тварыў.
16. На прыкладзе выбраных твораў пакажыце асноўныя тэндэнцыі развіцця жанраў «нізавога» і «сярэдняга» барока – палітычнай сатыры, песенна-інтымнай лірыкі, інтэрмедый для школьнага тэатра.
17. Чаму ў Францыі ў XVII ст. барока саступіла ініцыятыву класіцызму? Чаму адным з галоўных відаў класіцысцкага мастацтва там стаў тэатр?
18. Якія рысы «сапраўднай літаратуры» вылучыў у сваім вершаваным трактаце «Паэтычнае майстэрства» Нікаля Буало? Перакажыце сваімі словамі сутнасць тых патрабаванняў, якія Буало выстаўляў да лірычнай і эпічнай паэзіі, трагедыі, драмы.
19. Якім чынам ідэі Буало знайшлі адлюстраванне ў камедыях Мальера, і ў чым апошні адышоў ад іх?
20. Што такое мальераўская камедыя «характараў»? Праілюструйце сваё выказванне прыкладамі з камедыі Мальера «Тарцюф, або Ашуканец».
21. Што Мальер высмейвае ў сваёй камедыі «Тарцюф»? Чаму

Тарцюф выяўляе сваё сапраўднае аблічча толькі ў III дзеі? У якіх сітуацыях найбольш яскрава выяўляецца двурушнасць Тарцюфа? З якой мэтай уведзены вобраз каралеўскага пасланца-афіцэра? Ці выклікае гэтая камедыя толькі смех?

22. Назавіце асноўных творцаў французскага класіцызму ў архітэктуры, жывапісе, дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве.
23. Якім паказаны вобраз беларускага паэта і асветніка Сімяона Полацкага ў вершы Дануты Бічэль «Вершатворца Сімяон Полацкі»?

## ТЭМА X. ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА

1. Назавіце краіны, дзе асветніцкі рух пачаў фарміравацца раней за ўсё?
2. Сфармулюйце пералік асноўных рысаў, што характарызуюць эпоху Асветніцтва, паводле эсэ Імануэля Канта «Што такое Асветніцтва?»
3. Якія найважнейшыя плыні развіваліся ў гэты час у мастацтве? У літаратуры?
4. Раскажыце пра найважнейшыя здабыткі Венскай класічнай школы ў музыцы? У чым палягае, на вашу думку, геніяльнасць музыкі В. А. Моцарта?
5. Чаму расійскі класіцызм толькі ў абмежаванай ступені меў асветніцкія рысы?
6. Раскажыце пра дзейнасць стваральнікаў французскай «Энцыклапедыі мастацтваў, навук і рамёстваў».
7. Якім чынам асветніцкія ідэі ўплывалі на жыццё насельнікаў тагачаснай Рэчы Паспалітай, у тым ліку Вялікага Княства Літоўскага? Як магнаты беларуска-літоўскага паходжання спрычыняліся да распаўсюджвання гэтых ідэй?
8. Раскажыце пра самыя значныя дасягненні заходнееўрапейскіх, беларускіх і расійскіх майстроў выяўленчага мастацтва плыняў ракако, барока і класіцызму.

9. Растлумачце паняцце «віленскага барока» ў архітэктуры ВКЛ. Прывядзіце прыклады пабудоў віленскага барока ў Беларусі.
10. Падрыхтуйце рэферат або прэзентацыю пра жыццё і творчую дзейнасць заснавальніцы Нясвіжскага тэатра, паэткі і драматурга Францішкі Уршулі Радзівіл.
11. Ахарактарызуйце самыя важныя творчыя здабыткі кампазітараў, якія працавалі ў Беларусі – Міхала Казіміра Агінскага, Мацея Радзівіла, Яна Дамініка Голанда.
12. У чым вызначаюцца асаблівасці асветніцкага класіцызму, асветніцкага рэалізму, сентыменталізму як плыняў літаратуры Асветніцтва?
13. Якія асветніцкія ідэі найбольш яскрава выяўляюць сябе ў творчасці Вальтэра, Бамаршэ і Русо?
14. У чым, на ваш погляд, праявіліся творчыя дасягненні майстроў брытанскага рэалістычна-асветніцкага рамана (на матэрыяле твораў Дэніэла Дэфо, Джонатана Свіфта або Генры Філдынга)?
15. Якія класіцысцка-асветніцкія рысы мы можам прасачыць у «звярыных гратэсках» Дамініка Рудніцкага? У беларускамоўнай ананімнай грамадска-філасофскай лірыцы? У «Камедыі» Каятана Марашэўскага?
16. Што ўвасабляюць сабою вобразы селяніна Дзёмкі, Д'ябла і Яўрэя з «Камедыі» Марашэўскага?
17. Раскажыце пра змест і мастацкія асаблівасці паэмы літоўскага паэта Крысціёнаса Данялайціса «Чатыры пары года».
18. Якія чынам эстэтыка класіцызму выяўляе сябе ў паэзіі Міхайлы Ламаносава і Гаўрылы Дзяржавіна? У камедыі Дзяніса Фанвізіна «Недарасль»?
19. Якім чынам рысы сентыменталізму і перадрамантызму выяўляюць сябе ў лірыцы шатландскага паэта Роберта Бёрнса?
20. У чым палягае значэнне творчасці заснавальніка польска-беларускага сентыменталізму Францішка Дыянізія Князьніна?

21. Характэрныя рысы якіх пострэнесансавых і асветніцкіх плыняў можна бачыць у дакументальнай аповесці Саламеі Пільштыновай «Авантуры майго жыцця»?
22. Назавіце галоўныя рысы нямецкага асветніцка-літаратурнага руху «Бура і націск». Ахарактарызуйце драматургічны талент і глыбокае веданне гісторыі Фрыдрыхам Шылерам на падставе прачытаных фрагментаў з яго няскончанай гістарычнай драмы «Дзімітрый».
23. Што вы ведаеце пра жыццёвы і творчы шлях Ёгана Вольфганга Гётэ?
24. У якіх творах, на вашу думку, Гётэ найлепш выявіў сябе як паэт-лірык?
25. Чаму трагедыю Гётэ «Фаўст» прынята лічыць сапраўднай вяршыняй еўрапейскай літаратуры эпохі Асветніцтва?
26. Як вы можаце растлумачыць звяртанне Гётэ да сярэднявечнай народнай кнігі пры распрацоўцы сюжэту трагедыі «Фаўст»?
27. Як у гэтай трагедыі раскрываюцца адвечныя праблемы змагання Дабра і Ліха?
29. Дайце сваю характарыстыку вобразам Фаўста, Маргарыты, Мефістофеля, Вагнера, персанажам з народу.
30. Як вы можаце ацаніць майстэрства перакладчыка «Фаўста» на беларускую мову Васіля Сёмухі? Падбярыце найбольш, на вашу думку, характэрныя цытаты з гэтага перакладу.
31. Якім чынам Юзаф Ігнацы Крашэўскі ў сваіх гістарычна-мастацкіх творах апісвае радзівілаўскую сталіцу, беларускі горад Нясвіж?

## ВЫКАРЫСТАНЫЯ КРЫНІЦЫ

Астраух А. Э. Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2001.

Беларуская літаратура. 9 клас (паглыбл. узровень). Ч. 1. Мн.: Маст. літ., 2006.

Блахіна Л. В., Вазінская Т Я, Мароз Т І., Пешын С У. Айчынная і сусветная мастацкая культура: вуч. дапам. для 9 кл. Мн.: Беларусь, 2006.

Блохина Л. В., Вазинская Т. Я., Мороз Т. И. Отечественная и мировая художественная культура: уч. пособие для 8 кл. Мн.: Беларусь, 2006.

Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011.

Мастацтва (Айчынная і сусветная мастацкая культура): Вуч. дапам. для 7 кл. / Аўтары: Н. С. Валанцэвіч, С. І. Колбышава. Ю. Ю. Захарына і інш. Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2017.

Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997.

Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001.

Słowa na czasie-1, 2, 3: Podręcznik dla kształcenia literackiego i kulturowego w gimnazjum. / Chmiel, M., Herman, W., Pomirska, Z., Doroszewski, P. Warszawa: Nowa Era, 2012.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Гісторыя Расіі
## ад пачаткаў да сённяшніх дзён

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Лявон Баршчэўскі,*
кандыдат філалагічных навук

Адказны рэдактар:
*Алег Трусаў,*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# УСТУП

Праграма «Гісторыя Расіі ад пачаткаў да сённяшніх дзён» з'яўляецца часткай вывучэння курса гісторыі ў гуманітарным ліцэі з беларускай мовай навучання». Праграма падрыхтаваная кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Алегам Трусавым і кандыдатам філалагічных навук Лявонам Баршчэўскім у межах планавай працы Навукова-творчага калектыву «Еўрапейская школа – XXI стагоддзе» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай школы». У адпаведным вучэбным курсе прадугледжана сістэматызаванае вывучэнне гісторыі Расіі ад узнікнення ўсходнеславянскіх дзяржаўных утварэнняў да сённяшніх дзён. Тут на парадак больш падрабязна, чым у школьных праграмах для агульнаадукацыйнай школы, разглядаецца расійская палітычная, эканамічная і культурная гісторыя. Аўтарамі гэтай праграмы, пры ўдзеле кандыдата гістарычных навук, дацэнта Паўла Церашковіча і кандыдата мастацтвазнаўства Аляксея Хадыкі, падрыхтаваны да друку адпаведны вучэбны дапаможнік у выглядзе ілюстраванага нарыса.

Неабходнасць вывучэння ў Беларусі курса расійскай гісторыі, свабоднага ад імперскіх ідэалагем, ад абагаўлення вялікарускага народа як носьбіта нейкай асаблівай духоўнасці, ад прыніжэння месца іншых народаў у гісторыі рэгіёнаў цяперашняй Расійскай Федэрацыі вынікае з таго, што працы шмат якіх нашых гісторыкаў і дзеянні галоўных палітычных дзеячаў сучаснай Рэспублікі Беларусь пакуль што моцна хворыя на каланіяльны сіндром. Нават з вуснаў прэзідэнта незалежнай Беларусі можна пачуць выразы кшталту: «мы – малодшыя браты вялікага рускага народа…» Хоць любы непрадузяты гісторык скажа, што сярод масы славянскіх плямёнаў і іх нашчадкаў няма і не можа быць братоў «старэйшых» ці «малодшых». Расійская гістарыяграфія, якая з даўніх часоў была здамінаваная працамі, што ствараліся, каб дагадзіць разна-

стайным уладарам дзяржавы, нягледзячы на яе пэўныя дасягненні, да сёння перапоўненая міфамі, падтасоўкамі і проста несумленнымі інтэрпрэтацыямі.

На жаль, пасля ўзмацнення т. зв. інтэграцыйных працэсаў Беларусі з Расійскай Федэрацыяй зноў, як і цягам апошніх двух з лішкам стагоддзяў, пачала адбывацца пэўная «карэктаванне» ў асвятленні самых розных гістарычных падзей. У гісторыкаў, якія забяспечваюць «абгрунтаванне» думак, выказаных прадстаўнікамі ўлады, ізноў пачаў пераважаць «усходні» вектар палітыкі разам з прапагандай неабходнасці так званай «саюзнай дзяржавы», абяленнем злачынстваў камуністычнага рэжыму і тлумачэннем іх «гістарычнай неабходнасці».

І калі гісторыю нацыі ў шырокім сэнсе слова яны перакрэсліць не ў стане, то існаванне і гістарычнае значэнне беларускай дзяржаўнасці ў суседняй Расіі ставяць пад сумненне пастаянна. Усё гэта і падштурхнула аўтараў скласці курс гісторыі Расіі, у якім не абсалютызуецца імперская дзяржава як інструмент гвалту над сваім і іншымі народамі, у якім аддаецца павага да самых розных нацый і народнасцяў, якія на нейкі час або і да сёння апынуліся ў складзе дзяржавы, пра якую Астольф дэ Кюстын, французскі падарожнік і літаратар, яшчэ ў 1839 г. пісаў: «Якой бы неабдымнай ні была гэтая імперыя, яна ёсць нічым іншым, як турмой, ключ ад якой захоўваецца ў імператара». У кан'юнктурных мэтах называў Расію «турмой народаў» таксама і Уладзімір Ленін.

У праграме курса, які прапаноўваецца, значная ўвага надаецца механізмам фарміравання і функцыянавання Расійскай імперыі ў яе розных іпастасях (у т л. «Савецкі Саюз», «Расійская Федэрацыя»), што выбудоўваліся цягам больш як паловы тысячагоддзя.

Аўтары курса вялікае значэнне надаюць згадванню пра дасягненні культуры і навукі розных народаў, што насялілі Расійскую імперыю ў мінулым і насяляюць Расійскую Федэрацыю

сёння. Для іх выглядае недапушчальным тое, што ў расійскіх падручніках па гісторыі паняцці «руская культура» і «культура Расіі» звычайна атаясамліваюцца.

Праграма, што тут прапаноўваецца, складаецца з уводзінаў, 10 асноўных раздзелаў, прысвечаных розным эпохам гісторыі тэрыторый, што ўваходзілі або ўваходзяць у склад Расіі, і заключэння, у якім аўтары спрабуюць асэнсаваць пытанне, ці мае далейшую перспектыву экстэнсіўнае імперскае развіццё сучаснай РФ, або ўсё-такі расійскаму народу трэба вяртацца да традыцый гуманістычнай культуры, у т. л. палітычнай.

У выніку засваення курса «Гісторыя Расіі ад пачаткаў да сённяшніх дзён» навучэнцы павінны *ведаць*:

– перыядызацыю найважнейшых гістарычных падзей на тэрыторыі Расіі ад пачаткаў да сённяшніх дзён;
– асноўныя падзеі ў гісторыі ўсходнеславянскіх княстваў і земляў Маскоўскай дзяржавы, Расійскай імперыі, Савецкага Саюзы, Расійскай Федэрацыі (у межах, вызначаных праграмай);
– найбольш значных гістарычных асоб і дзеячаў культуры Расіі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў;
– сувязь прычын і наступстваў падзей гісторыі Расіі і сумежных краін;
– сутнасць як рэвалюцыйнага, так і эвалюцыйнага шляху развіцця Расіі ў розныя перыяды яе гісторыі;
– асаблівасці развіцця гісторыі і культуры тэрыторый сучаснай Расіі, звязаныя з кліматычнымі ўмовамі і культурна-рэлігійнымі асаблівасцямі народаў, што яе насяляюць;
– ролю гісторыі духоўнай і матэрыяльнай культуры ў агульным гістарычным працэсе развіцця еўрапейскай і азіяцкай цывілізацый;
– асноўныя этапы стварэння расійскай нацыі і яе дачыненні з цывілізацыямі Еўропы і Азіі.

Навучэнцы павінны *ўмець*:

- лакалізоўваць падзеі гісторыі ў часавых прамежках і прасторы;
- суадносіць працэсы, з'явы і падзеі гісторыі Расіі з набытымі ведамі па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, а таксама аргументавана тлумачыць характар гэтага суаднясення;
- сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты і на падставе гэтага рабіць аргументаваныя высновы;
- даваць разгорнутую характарыстыку дзейнасці палітычных, дзяржаўных дзеячаў, а таксама дзеячаў культуры адпаведных эпох;
- аргументавана выказваць свой пункт погляду на тыя ці іншыя гістарычныя працэсы або падзеі;
- бачыць адрозненні паміж нацыянальнай і імперскай ідэнтычнасцю; умець характарызаваць небяспечнасць апошняй;
- эфектыўна шукаць неабходную гістарычную інфармацыю ў разнастайных крыніцах;
- рыхтаваць рэфераты, даклады, прэзентацыі па тэматыцы, прапанаванай выкладчыкам або выбранай самастойна ў межах праграмы курса.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ ДА ЎСЯГО ВУЧЭБНАГА КУРСА

Анисимов Е. В. Иллюстрированная история России. С.-Петербург: Норинт, 2003. 208 с.

Геллер М. История Российской империи. В 3-х томах. Москва: МИК, 1997. Т. I – 448 с., т. II – 320 с., т. III – 304 с.

Грушевский Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. 768 с.

Дворниченко А. Ю., Кащенко С. Г., Флоринский М. Ф. Отечественная история (до 1917 г.): Учеб. пособие / Под ред. проф. И. Я. Фроянова. Москва: Гардарики, 2002. 445 с.

Дворниченко А. Ю., Ильин Е. В. и др. Русская история с древнейших времен до наших дней. Изд. 4-е. С.-Петербург: Лань, 2004. 448 с.

Історія України: Навч. посіб. / В. І. Гусев, Ю. О. Калінцев, С. В. Кульгицький. За ред. С. В. Кульгицького. Київ: Вища шк., 2003. – 431 с.

История Отечества в терминах и понятиях. Словарь-справочник. / Сост. В. Блохин. Москва: Курсив; Смоленск: Русич, 1999. 527 с.

История России (IX – начало XXI в.). Под ред. А. Ю. Дворниченко и В. С. Измозика. 3-е изд., испр. и доп. Москва: Гардарики, 2007. 479 с.

Історія України: Навч. посіб. / В. І. Гусев, Ю. О. Калінцев, С. В. Кульгицький. За ред. С. В. Кульгицького. Київ: Вища шк., 2003. 431 с.

Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: Учеб. пособие / Авт.: И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. Москва: Российск. гос. гуманит. ун-т, 1998. 702 с.

Краткая художественная энциклопедия. Искусство стран и народов мира. Т. 3. Москва: Советская Энциклопедия, 1971. С. 301–767.

Краткий курс истории России с древнейших времён до начала XXI в.: уч. пособие / Р. А. Арсланов и др.; под ред. В. В. Керова. Москва: Астрель, 2013. 846 с.

Культурология. История культуры России. / Сост. Алексеев А. И., Измозик В. С. и др. С.-Петербург: СЗЗТГУ, 2005. 220 с.

Нагаева Г. История России в схемах, терминах, таблицах. Изд. 5-е. Ростов н/Д: Феникс, 2016. 93 с.

Платонов С. Ф. Учебник русской истории. С.-Петербург: Наука, 1994. 429 с.

Словарь исторических терминов по дисциплине «Отечественная история» / сост. Хайретдинов Р. Х. Уфа: УГНТУ, 2007. 41 с.

Соловьев С. М. Чтения и рассказы по истории России. Москва: Правда, 1990. 768 с.

Сухорукова О. А. Этническая история России: Уч. пособие. Ч. 1. Москва: МГПУ, 2015. 204 с.

Трусаў А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Выд. 2-е, папр. Мн.: Зміцер Колас, 2017. 356 с.

Фортунатов, В. В. История: Учебное пособие. Стандарт третьего поколения. Для бакалавров. С.-Петербург: Питер, 2013. 464 с.

Хрестоматия по истории России с древнейших времен. В 4-х тт. Сост. И. В. Бабич и др. Москва: Междунар. отношения, 1994–1995. Т. 1: 352 с.; Т. 2 (ч. 1): 279 с.

Bazylow, L., Wieczorkiewicz, P. Historia Rosji. Wrocław: Ossolineum, 2006. 632 s.

Dvornik, F. The Slavs in European History and Civilization. New Brunswick – New Jersey: Rutgers Univ. Press, 1962. 695 p.

Riasanovsky, N., Steinberg, M. A History of Russia. Eighth Edition. Oxford Univ. Press, 2016. 816 p.

Strahl, Ph., Herrmann, E. Geschichte des russischen Staates. [Ravensburg:] Nabu Press (Taschenbuch), 2011. 500 S.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

**Уводзіны** (*лекцыя*). Вывучэнне расійскай гісторыі: асноўныя падыходы, крыніцы, багацце інтэрпрэтацый, факты і фальсіфікацыі.

Крыніцы сярэднявечнай гісторыі Расіі: праблема верагоднасці летапісных зводаў.

«Нарманісты» і «антынарманісты»: спрэчка пра паходжанне дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях.

Пачаткі гісторыі ўсходніх славян і Расіі. Усходнія славяне ў VII–VIII стст.

## I. Кіеўская Русь і сучасная Расія

Ужыванне паняцця «Кіеўская Русь» у розных аўтараў і яго ідэалагізаванасць. Паходжанне слова «русь». Праблема дачынення гісторыі Кіеўскай Русі да гісторыі сучаснай Расіі ў працах украінскіх, расійскіх і заходніх аўтараў. Узнікненне Кіеўскай Русі. Кіеўская Русь у X–XI стст. Гісторыя дынастыі Рурыкавічаў, асноўныя падзеі, звязаныя з яе кіраваннем. Раннефеадальныя адносіны ў Кіеўскай Русі. Ступень пераемнасці пазнейшай маскоўскай і расійскай дзяржаўнасці з характарам дзяржаўнасці Кіеўскай Русі.

Уладзіміра-Суздальская зямля. Пачаткі ўласна расійскай дзяржаўнасці.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Баяры*** – найвышэйшая знаць сярэднявечнага землеўласніцкага грамадства, у т л. ва ўсходнеславянскіх княствах.

***Вотчына*** – буйны зямельны надзел, атрыманы ў спадчынную ўласнасць.

***Даніна*** – рэгулярны грашовы пабор з падпарадкаванага племені або народа.

***Закупы*** – чалавек, які ўзяў у землеўласніка пазыку («купу») грашыма або таварамі і абаявзаны адпрацоўваць у апошняга, пакуль не верне купы.

***Ізгой*** – чалавек, які быў пазбаўлены сацыяльнага статусу (халоп, адпушчаны на волю без зямлі).

***Каланісты*** («***сваяземцы***») – сяляне, што жылі на межах краіны і засялялі новыя землі, якія яны лічылі сваёй уласнасцю.

***Кармленне*** – прывілей, які вялікія і ўдзельныя князі давалі сваім васалам, паводле якога мясцовая адміністрацыя ўтрымлівалася за кошт насельніцтва на працягу ўсяго жыцця.

***Князь*** – правадыр племя, саюза плямён, пазней кіраўнік дзяржавы ва ўсходніх славян.

***Пагосты*** – вызначаныя князем месцы збору даніны.

***Палюддзе*** – штогадовы аб'езд князя з дружынай падуладных ім земляў з мэтай збору даніны і кармлення.

***Пасад*** – частка града за ўмацаванымі сценамі (мурамі).

***Пасадскія людзі*** – гараджане.

***Радовіч*** – часоваабавязаны, паўсвабодны смерд, які трапіў у часовую залежнасць у выніку «раду» – дамовы, на падставе якой ён працаваў у гаспадара.

***Смерды*** – уся маса вясковага насельніцтва, вольныя сяляне, якія плацілі даніну; напалову свабодныя княжацкія даннікі, якія сядзелі на зямлі і адпрацоўвалі павіннасць на карысць князя.

***Удзелы*** – тэрыторыі, якімі валодалі прадстаўнікі княскага роду.

***«Урокі»*** – памеры даніны і сама даніна.

***Халопы*** – катэгорыя залежнага насельніцтва, якая знаходзілася ў поўнай залежнасці ў свайго гаспадара.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

Археология Украинской ССР в трёх томах. Том 3. Раннеславянский и древнерусский периоды. / Под ред. Артеменко И. И. Киев: Наукова Думка, 1986. 757 с.

Галушко, К. Український націоналізм. Київ: Вид. АБА-ГА-ЛА-МА-ГА, 2017. 129 с.

Грушевский Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. С. 3–585.

История Киева. (В трёх томах, четырёх книгах). Том первый: Древний и средневековый Киев. Киев: Наукова Думка, 1982. 407 с.

Крип'якевич І. П. Історія України. Львів: Світ, 1990. С. 33–71.

Оргиш, В. П. Древняя Русь: Образование Киевского государства и введение христианства. / Под ред. Е. М. Бабосова. Мн.: Наука и техника, 1988. 150 с.

Петрухин В. Я. Начало этнокультурной истории Руси IX–XI веков. Смоленск: Русич; Москва: Гнозис, 1995. 320 с.

Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012, p. 1–148.

Strahl, Ph., Herrmann, E. Geschichte des russischen Staates (= Geschichte der europäischen Staaten: 2). 7 Bde. 1832–1866. Bd. 1: Von den ältesten Zeiten bis zum Einbruche der Tataren 1224. Perthes, Hamburg u. a.,1832. 484 S.

## II. Этнічная гісторыя сярэднявечнай Русі

Складаны характар узаемадзеянняў этнасаў на землях Уладзіміра-Суздальскай, Наўгародскай Русі і тэрыторыях на ўсход і на поўдзень ад іх. Славяне і гісторыя іх з'яўлення. Фіна-угры. Цюркі і манголы. Іранскія плямёны.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Этнас (этнічная супольнасць)*** – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.

***Этнічная група*** – група прадстаўнікоў пэўнага народа (частка этнасу), якая пражывае па-за межамі яго этнічнай тэрыторыі. Адрозніваецца ўласнай мовай, культурай, побытам, самасвядомасцю, рэлігіяй. Радзей і антрапалагічным тыпам.

***Этнічная тэрыторыя*** – тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа (этнасу), з якой цесна звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя. Вызначаецца ўстойлівасцю на працягу многіх стагоддзяў.

***Этнагенез*** – працэс фарміравання этнічнай супольнасці. У шырокім сэнсе слова «этнагенез» ахоплівае вялікі гістарычны перыяд складвання і існавання этнасу ў розных этнасацыяльных формах.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


Агусти Алемань. Аланы в древних и средневековых письменных источниках. Москва: Менеджер, 2003. 608 с.

Аяган Б. Г. Тюркские народы: Энциклопедический справочник. Алматы: Қазақ энциклопедиясы, 2004. 382 с.

Закиев М. З. Происхождение тюрок и татар. Москва: Инсан, 2002. 496 с.

Народы Поволжья и Приуралья. Коми-зыряне. Коми-пермяки. Марийцы. Мордва. Удмурты. Отв. ред. Н. Ф.Мокшин и др. Москва: Наука, 2000. 579 с.

Петрухин В. Я., Раевский Д. С. Очерки истории народов России в древности и раннем Средневековье. 2-е изд. Москва: Знак, 2004. 416 с.

Рябинин Е. А. Финно-угорские племена в составе Древней Руси. С.-Петербург: Изд-во СПбГУ, 1997. 260 с.

Седов В. В. Славяне в раннем Средневековье. Москва: Наука, 1995. 416 с.

Сулимирский Т. Сарматы. Древний народ юга России / Пер с англ. Москва: Центрполиграф, 2008. 191 с.

Сухорукова О. А. Этническая история России. Ч. 1. Москва: МГПУ, 2015. 204 с.

Шахматов А. А. Очерк древнейшего периода истории русского языка. Энциклопедия славянской филологии / Под ред. орд. Акад. И. В. Ягича (Вып. 11.1). Петроград: Типогр. Императ. Академии наук, 1915. 421 с.
Bačič, J. Slav: The Origin and the Meaning of the Ethnonym // Slovene Studies. 1987. #9/1–2. P 33–41.
Финно-угры в России. *Рэжым доступу*: http://maxpark.com/community/13/content/2140214
Этнография России. *Рэжым доступу*: http://www.russiafederation.ru/ethnography/

## III. Лёс Наўгародскай Русі

Узнікненне Наўгародскай рэспублікі. Абвяшчэнне незалежнасці Ноўгарада. Дэмакратычны вечавы лад і сістэма кіравання. Культура Наўгародскай зямлі. Прычыны заняпаду і падпарадкавання Ноўгарада Маскве.

Пскоўская рэспубліка і іншыя дзяржаўныя ўтварэнні Паўночна-Заходняй Русі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Абшчына*** – форма аб'яднання людзей, якая характарызуецца агульным валоданнем сродкамі вытворчасці, поўным або частковым самакіраваннем.

***Веча*** – народны сход у княствах Заходняй, Паўднёва-Заходняй і Паўночна-Заходняй Русі. Складаўся з мужчын. Веча прымала рашэнні ў пытаннях вайны і міру, зацвярджала законы, заключала адмовы з іншымі землямі, прызывала і праганяла князёў (галоўная функцыя якіх палягала ў камандаванні рэгулярным войскам-дружынай). У Ноўгарадзе, Пскове і Вяцкай зямлі дзейнічала да XVI ст.

***Апсіда*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае выступ будынка паўкруглай або мнагавугольнай формы, накрыты купалам або самкнёным скляпеннем.

***«Жыцці людзі»*** – грамадскі клас у Ноўгарадзе, які займаў прамежкавае становішча паміж баярамі і сярэднім купецтвам.

***Земцы*** – слой сялян-уласнікаў, хаарктэрны для Наўгародскай і Пскоўскай земляў.

***Ноўгарадска-маскоўская ерась («жидовствующие»)*** – рух у Ноўгарадзе і Маскве, які склаўся ў канцы XV ст. і адмаўляў аўтарытэт і абрады афіцыйнай праваслаўнай царквы.

***Пасаднік*** – галава выканаўчай улады ў Ноўгарадзе.

***Пяціны*** – адміністрацыйныя вобласці ў Ноўгарадзе.

***Народнае рушанне (апалчэнне)*** – вайсковыя атрады, якія ствараліся падчас вайны з дваран, гараджан і свабодных сялян.

***Рада паноў*** – вышэйшая судовая палата ў Ноўгарадзе і Пскове.

***Тысяцкі*** – камандзір вайсковага народнага рушання (апалчэння).

***Уладыка-архіепіскап*** – найвышэйшы царкоўны іерарх у Ноўгарадзе.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

Андреев В. Ф. Северный страж Руси: Очерки истории средневекового Новгорода. Ленинград: Лениздат, 1989. 175 с.

Мартышин О. В. Вольный Новгород. Общественно-политический строй и право феодальной республики. Москва: Российское право, 1992. 384 с.

Мусин А. Е. Церковь и горожане средневекового Пскова: Историко-археологическое исследование. С.-Петербург: Факультет филологии и искусств СПбГУ, 2010. 364 с.

Подвигина Н. Л. Очерки социально-экономической и политической истории Новгорода Великого в XII–XIII вв. Москва: Высшая школа, 1976. 154 с.

Янин В. Л. Средневековый Новгород. Москва: Наука, 2004. 416 с.

Leuschner, J. Novgorod: Untersuchungen zu einigen Fragen seiner Verfassungs- und Bevölkerungsstruktur. Berlin: Duncker & Humblot, 1980. 288 S.

## IV. Пачаткі Маскоўскай Русі

Заходняя палітыка маскоўскіх уладароў. Усталяванне мангола-татарскай улады. Барацьба за ярлык вялікага князя ўладзімірскага. Маскоўская Русь і Залатая Арда. Маскоўская Русь і княствы Паўночна-Усходняй Русі. Узмацненне Масквы і яго вынікі. Сацыяльна-эканамічны лад Маскоўскага і іншых усходнеславянскіх княстваў у XIV–XV стст. Культура Маскоўскага і іншых усходнеславянскіх княстваў у XIV–XV стст. Традыцыйная культура фіна-ўгорскіх народаў Наўгародскай і Маскоўскай Русі. Балты ў басейне Акі. Цюркскія народы і іх культура. Традыцыйная культура іранскіх народаў (аланы).

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бабыль*** – адзінокі селянін, які не меў зямельнага надзела.

***Баскак*** – прадстаўнік ардынскага хана ва Усходняй Русі.

***Басма*** – пласцінка, якая выдавалася мангола-татарскімі ўладарамі ў якасці даверчага ліста.

***Баярская дума*** – найвышэйшы савет Маскоўскай дзяржавы, які складаўся з прадстаўнікоў найвышэйшай арыстакратыі, але ніякіх рэальных паўнамоцтваў не меў.

***Валасцель*** – кіраўнік воласці, які ажыццяўляў адміністрацыйныя і судовыя функцыі. Утрымліваўся за кошт «кармлення».

***Выхад*** – рэгулярная даніна, якую збіралі ва Усходняй Русі для хана Залатой Арды.

***Даткавыя сяляне*** – асобы са складу цяглавага насельніцтва, аддадзеныя на пажыццёвую вайсковую службу.

***Дваравыя сяляне*** – чэлядзь і халопы, якія жылі пры двары землеўласніка і абслугоўвалі яго і яго сям'ю.

***Месніцтва*** – сістэма землеўласніцкай іерархіі ў Маскоўскай дзяржаве, паводлк якой месца землеўласніка перш за ўсё вызначалася яго паходжаннем, знатнасцю роду, заслугамі продкаў.

***Намеснік*** – афіцыйная асоба ў Маскоўскай дзяржаве, якая займалася ў воласці судом, зборам мыта, іншымі адміністрацыйнымі справамі. Пасада была скасаваная ў 1556 г. Замест наменікаў былі ўведзеныя «*галовы ўзлюбленыя*».

***«Няхціўцы» («нестяжатели»)*** – прадстаўнікі рэлігійна-палітычнага руху (Ніл Сорскі, Васіян Касой), якія выступалі супраць манастырскага землеўласніцтва і раскошы ў праваслаўных храмах і манастырах. Гэты рух быў афіцыйна асуджаны праваслаўнай царквой на Саборы ў 1503 г.

***Отракі*** – дваровыя слугі князя, малодшыя ўдзельнікі княскай дружыны.

***Пажылое*** – плата, якая бралася з селяніна за пераход ад аднаго землеўласніка да другога.

***Палоўнік*** – селянін у Маскоўскай дзяржаве, які залежаў ад землеўласніка, працаваў на апошняга і аддаваў яму палову ўраджаю.

***Памесце*** – зямельны надзел, які ўладары Маскоўскай дзяржавы давалі служылай асобе за выкананне вайсковай службы.

***Путныя баяры*** – баяры, якія атрымлівалі пад сваё кіраванне і ў кармленне ў дарозе асобныя падраздзяленні: лоўчага, канюшага, чашніка і інш.

***Стральцы*** – служылыя людзі, якія знаходзіліся на пастаяннай службе ў маскоўскім войску.

***Судзебнікі*** – зборнікі законаў Маскоўскай дзяржавы.

***Сялянскі выраз*** – вывад сялян землеўласнікам ад папярэдняга землеўласніка гвалтам або па дамоўленасці з сялянамі.

***Цягла*** – грашовыя і натуральныя дзяржаўныя павіннасці сялян і пасадскіх людзей.

***Ярлык*** – пацверджанне мангольскімі ханамі права ўсходнеславянскага князя на княжанне; выдаваўся напачатку ў вуснай, а пазней і ў пісьмовай форме.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


Горский А. А. Русские земли в XIII–XIV вв.: пути политического развития. Москва: ИРИ РАН,1996. 128 с.

Горский А. А. От земель к великим княжениям: «примыслы» русских князей второй половины XIII–XV вв. Москва: Индрик 2010. 176 с.

Греков И. Б., Шахмагонов Ф. Ф. Мир истории: Русские земли в XIII–XV веках. Москва: Молодая гвардия, 1986. 334 с.

История русского искусства в 13 тт. / Под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 2. Москва: Изд-во АН СССР, 1954. 426 с.

Каменская, Е.Ф. Шедевры древнерусской живописи. Москва: Советский художник, 1917. 60 с.

Кульпин Э. С. Золотая Орда. Москва: Московский лицей, 1998. 243 с.

Кучкин В. А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв.. Москва: Наука, 1984. 353 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 128–138.

Летапісы і хронікі Беларусі: Сярэднявечча і раньнемадэрны час. Прадм. і ўкл. В. Вароніна. Тэматычны дадатак да часопіса ARCHE, 2009, №9. 902 с.

Любимов Л. Д. Искусство Древней Руси : Кн. для чтения. Москва: Просвещение, 1974. С. 127–294.

Мыськов Е. П. Политическая история Золотой Орды (1236–1313 гг.). Волгоград: Издательство Волгогр. гос. ун-та, 2003. 178 с.

Почекаев Р. Ю. Цари ордынские. Биографии ханов и правителей Золотой Орды. 2-е изд. С.-Петербург: Евразия, 2012. 464 с.

Святая Земля в русском искусстве. Каталог. Москва: ГТГ, 2001. 368 с.

Творогов О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 56–93.

Темушев В. Н. Территория и границы Московского княжества

в конце XIII первой половине XIV в.: дис. … канд. ист. наук. Минск, 2002.
Трусаў А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Выд. 2-е, папр. Мн.: Зміцер Колас, 2017. 356 с.
Шабульдо Ф. М. Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского. Киев: Наукова думка, 1987. 183 с.
Kirchen und Klöster im alten Russland. Stilgeschichte der altrussischen Baukunst von der Kiewer Rus bis zum Verfall der Tatarenherrschaft. Von Hubert Faensen. Leipzig: Koehler & Amelang, 1982. 267 S.
Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012, p. 149–363.

## V. Маскоўская дзяржава ў XVI ст.

Палітыка Васілія III, Івана IV, Фёдара Іванавіча, Барыса Гадунова. Лівонская (Інфлянцкая) вайна і вайна са Швецыяй. Сацыяльна-эканамічная палітыка Маскоўскай дзяржавы. Эвалюцыя дзяржаўных механізмаў. Культура Масковіі ў XVI ст.: фарміраванне ў ёй імперскага характару.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Аброк*** – штогадовы збор памешчыкамі грошай і прадуктаў з прыгонных сялян. У Маскоўскай дзяржаве і Расійскай імперыі існаваў да адмены прыгону.

***Акольнічыя*** – прыдворны чын і пасада ў Маскоўскай дзяржаве. Узначальвалі прыказы, выконвалі прыдворныя і вайсковыя абавязкі.

***Апрычніна*** – уведзены Іванам IV Жахлівым («Грозным») асаблівы парадак кіравання Маскоўскай дзяржавай, які грунтаваўся на фізічным тэроры і знішчэнні людзей.

***Бліжняя дума, Выбраная рада*** – колы асоб, асабліва наближаных да цара Івана IV, якія былі ў сярэдзіне XVI ст. неафіцыйным урадам Масковіі.

***Губныя ўстановы*** – органы мясцовага кіравання ў Маскоўскай дзяржавы, якія існавалі з 1630-х гг., займаліся напачатку вышукам і судом у крымінальных справах, пазней таксама і іншымі адміністрацыйнымі справамі. Былі скасаваныя ў пачатку XVIII ст.

***«Дамастрой»*** – звод правілаў хатняга побыту жыцця ў Масковіі, складзены духоўнікам цара Івана IV манахам Сільвестрам.

***Дваранства*** – прывілеяванае, паноўнае саслоўе ў Маскоўскай дзяржаве і пазней у Расійскай імперыі, якое знаходзілася на царскай службе.

***Думныя дзьякі*** – чыноўнікі найніжэйшага рангу, якія складалі і правілі рашэнні Баярскай думы і царскія ўказы, займаліся справаводствам.

***Думныя дваране*** – трэці паводле значэння, пасля баяраў і акольнічых, ніжэйшы думны чын.

***Закамара*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне знешняга боку сцяны будынка, якое сваёй формай адпавядае скляпенню.

***«Запаведныя леты»*** – гады, у якія ў некаторых рэгіёнах Маскоўскай дзяржавы забараняўся пераход ад аднаго землеўласніка да іншага.

***Захрыбетнікі*** – залежныя ад землеўласнікаў людзі, якія не мелі сваёй гаспадаркі, жылі і працавалі ў дварах сялян або пасадскіх людзей.

***Земскія ізбы*** – выбарныя органы мясцовага самакіравання ў гарадах і валасцях, у пачатку XVIII ст. – толькі ў гарадах, дзе з 1721 г. яны былі замененыя на магістраты і ратушы.

***Земскі сабор*** – найвышэйшая саслоўна-прадстаўнічая ўстанова Маскоўскай дзяржавы з 1549 па 1653 гг., сход прадстаўнікоў усіх слаёў насельніцтва (акрамя прыгонных сялян), які склікаўся дзеля абмеркавання палітычных, адміністрацыйных і гаспадарчых пытанняў.

***Земшчына*** – тэрыторыя Масковіі, якая падчас апрычніны не была ўключана ў склад апрычных земляў і якая кіравалася Іванам IV пры пэўным удзеле Баярскай думы і Земскіх сабораў.

***«Іасіфляне»*** – паслядоўнікі Іосіфа Волацкага, прадстаўнікі скрайне кансерватыўнай плыні ў маскоўскай праваслаўнай царкве, вострыя крытыкі «няхціўцаў» на чале з Нілам Сорскім.

***Какошнік*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае штучную закамару, якая мае выключна дэкаратыўнае прызначэнне.

***Капітэль*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае па-мастацку аформленая верхняя частка калоны або пілястры, якая размяшчаецца паміж ствалом апоры і яе гарызантальным перакрыццем.

***Манахромія*** – якасць мастацкага твора, якая грунтуецца на выкарыстанні адной фарбы пры вялікай колькасці градацый яе танальнасцяў.

***Машыкулі*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае адтуліны-байніцы ў паветцы, размешчанай наверсе муроў або вежаў крэпасці.

***Надзел*** – участак зямлі, які ў Маскоўскай дзяржаве даваўся селяніну ўзамен за выкананне ім ім розных павіннасцяў.

***Падворны падатак*** – сістэма падаткаабкладання насельніцтва, пры якой урад вызначаў агульную суму падаткаў, а гарадскія і сельскія абшчыны размяркоўвалі яе па асобных дварах.

***Падымшчына*** – падатак у Маскоўскай дзяржаве на карысць мясцовай адміністрацыі, які ўстанаўліваўся з кожнага «дыму» – г. зн. з сялянскай гаспадаркі.

***Палацавыя сяляне*** – прыгонныя сяляне, якія належалі асабіста цару і членам царскай сям'і.

***Палкі «новага строю»*** – вайсковыя атрады, якія фармаваліся, у асноўным з іншаземных наймітаў і казакоў, на ўзор арганізацыі і навучання заходнееўрапейскіх армій.

***Парсуна*** – прымітыўны ранні партрэтны жанр, распаўсюджаны ў Маскоўскай дзяржаве; творы гэтага жанру знаходзіліся ў моцнай залежнасці ад тагачаснага маскоўскага іканапісу.

***Пасошнае*** – дзяржаўны пазямельны падатак «з сахі», ямскія, пяцінныя і іншыя зборы.

***Патрыярх*** – уведзены ў 1589 г. найвышэйшы тытул у маскоўскай праваслаўнай царкве.

***Пілястра*** – тэрмін з архітэктуры; абазначае прамавугольны ў плане вертыкальны выступ на паверхні мура.

***Прыгоннае права*** – сукупнасць юрыдычных нормаў, паводле якіх сялянам забаранялася пакідаць свае зямельныя надзелы без дазволу землеўласніка. У Маскоўскай дзяржаве замацавалася з 1497 г.

***Прыказы*** – органы цэнтральнага кіравання ў Маскоўскай дзяржаве, якія займаліся галіновым кіраваннем гаспадаркай. Разбойны прыказ выконваў функцыі следства і вышуку. Манастырскі прыказ разбіраў судовыя справы духавенства, датычныя маёмасных адносінаў.

***Чарнасошныя сяляне*** (***«чорныя людзі»***) – цяглыя сяляне, якія, у адрозненне ад прыгонных сялян, былі асабіста незалежнымі.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

Герберштейн Сигизмунд. Записки о Московии. Пер. с нем. Москва: Изд-во МГУ, 1988. 430 с.

Зимин А. А. Опричнина Ивана Грозного. Москва: Мысль, 1964. 535 с.

История внешней политики России. Конец XV–XVII в. Москва: Международные отношения, 1999. 447 с.

История русского искусства в 13 тт. / Под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 3. Москва: Изд-во АН СССР, 1955. 745 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 138–142.

Скрынников Р. Г. Иван Грозный и его время. Москва: Наука, 1983. 250 с.

Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». Москва: Мысль, 1985. 206 с.

Творогов О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 94–105.

Филюшкин А. И. Василий III. Москва: Молодая гвардия, 2010. 352 с.

Шмидт С. О. У истоков российского абсолютизма. Москва: Прогресс, 1996 496 с.

Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012, p. 363–447.

## VI. Смутны час у Маскоўскай дзяржаве Маскоўская дзяржава ў XVII ст. ад пачатку царавання Раманавых

Паняцце «Смутнага часу». Передумовы ўзнікнення Смуты. Гаспадарчы крызіс. Духоўны крызіс грамадства. Незадаволенасць казацтва. Прыход да ўлады і характар кіравання Ілжэдзмітрыя І. Дзяржаўны пераварот у Маскве і абвяшчэнне царом Васілія Шуйскага. З'яўленне Ілжэдзмітрыя ІІ. Паўстанне пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава. Умяшальніцтва караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта ІІІ Вазы. Прапанова царскага скіпетра каралевічу Уладзіславу. Баярскія партыі ў Маскоўскай дзяржаве. Заняцце Масквы і Крамля атрадамі каралевіча Уладзіслава. Два апалчэнні і вызваленне Масквы. Абранне царом Міхаіла Раманава.

Сацыяльна-эканамічны лад і палітычнае развіццё Маскоўскай дзяржавы пасля Смутнага часу. Узмацненне цэнтралізацыі дзяржавы. Працяг гаспадарчага і духоўнага крызісу. Паўстанне Сцяпана Разіна. Раскол у маскоўскай праваслаўнай царкве. Знешняя палітыка маскоўскіх цароў. Эканамічная і вайсковая адсталасць Маскоўскай дзяржавы. Дыпламатычная ізаляцыя.

Змаганне за Украіну і за выхад да Балтыйскага мора. Войны з Рэччу Паспалітай і Швецыяй. Маскоўска-турэцкая вайна.

Культура і пачаткі навукі ў XVII ст.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Абсалютызм*** – нічым не абмежаваная манархічная ўлада. У Маскоўскай дзяржаве канчаткова склалася напрыканцы XVII ст.

***Атаман*** – найвышэйшы начальнік казацкага войска.

***Гарадавыя ваяводы*** – асобы, звычайна з адстаўных служылых людзей, якія ў XVII і XVIII стст. (да 1745 г.) загадвалі ў гарадах і ўездах (паветах) вайсковымі, паліцэйскімі, судовымі, адміністрацыйнымі, фінансавымі памеснымі справамі.

***Астрог*** – пункт размяшчэння вайсковых атрадаў, умацаваных драўлянай агароджай.

***Казакі*** – вайсковае саслоўе ў Маскоўскай дзяржаве, да якога належала насельніцтва некаторых рэгіёнаў і якое мела асаблівыя правы, ільготы і перавагі ўзамен за сваю абавязковую вайсковую службу.

***Інтэрвенцыя*** – гвалтоўнае ўзброенае ўмяшальніцтва адной або некалькіх дзяржаў у справы іншай.

***Лаўра*** – назва вялікага мужчынскага праваслаўнага манастыра, падпарадкаванага непасрэдна патрыярху.

***Мануфактура*** – форма прамысловай вытворчасці. Заснаваная на ручной працы і падзеле працоўных аперацый.

***Меркантылізм*** – гаспадарчая палітыка, скіраваная на першачарговае развіццё айчыннай прамысловасці і гандлю.

***Памеснае права*** – пераважнае права маскоўскага вайсковаслужылага дваранства валодаць дзяржаўнымі землямі з сялянствам, што на іх сядзіць.

***Перапісныя кнігі*** – зводныя дакументы падворных перапісаў мужчынскага насельніцтва «цяглых» падатных двароў з указаннем узросту і сваяцкіх адносінаў.

***Пяцінныя грошы*** – надзвычайны падатак, які спачатку спагаяўся з маёмасці свецкіх і царкоўных землеўласнікаў, пазней з сялян – у памеры пятай часткі іх гадавога прыбытку.

***Раскол (царкоўны)*** – рэлігійна-грамадскі рух у Маскoвіі, які ўзнік у сярэдзіне XVII ст. і прывёў да падзелу маскоўскай праваслаўнай царквы і ўзнікнення стараабрадніцтва.

***Рэгент*** – асоба, якая ажыццяўляе паўнамоцтвы кіраўніка манархічнай дзяржавы падчас малалецтва або недзеяздольнасці законнага манарха.

***Саборнае Улажэнне*** – звод законаў Маскоўскай дзяржавы, прыняты Земскім саборам у 1648–1649 гг.

***«Слова і справа гасударава»*** – сістэма палітычнага вышуку ў Маскоўскай дзяржаве. Кожны царскі падданы павінен быў пад страхам смерці даносіць пра вядомыя яму змовы супраць цара і членаў яго сям'і, зневажанне яго тытула, падазрэнне ў дзяржаўнай здрадзе.

***«Стаўбавыя дваране»*** – патомныя дваране знатных родаў, якія былі ўпісаныя ў адмысловыя рэестры («стаўбцы»).

***Сямібаяршчына*** – сярод іншага, назва маскоўскага ўрада, створанага ў ліпені 1610 г. пасля звяржэння з трона Васілія Шуйскага.

***Урочныя леты*** – уведзеныя ў 1597 г. летнія тэрміны, падчас якіх землеўласнікі маглі ўзбудзіць зыск аб вяртанні ім сялян-уцекачоў.

***Царкоўныя сяляне*** – сяляне, якія належалі праваслаўным царкоўным землеўласнікам і ўстановам.

***Чалабітная*** – прашэнне, скарга, заява.

***Ям*** – паселішча на паштовым шляху.

***Ярыжкі*** – размоўная назва бедных людзей, якія займаліся цяжкой фізічнай працай (грузчыкі і да т. п.).

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


Буганов В. И. Мир истории. Россия в XVII столетии. Москва: Молодая гвардия, 1989. 318 с.

Горсей Дж. Записки о России XVI – начала XVII в. / Пер. с англ. Москва: Изд-во МГУ, 1990. 288 с.

Грыцкевіч А. 1612 год у гісторыі Расіі… і яго тлумачэнне расійскімі палітыкамі і гісторыкамі // Грыцкевіч А. Выбранае. Мн.: Кнігазбор, 2012. С. 537–551.

История русского искусства в 13 тт. / Под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 4. Москва: Изд-во АН СССР, 1959. 697 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 143–148.

Любимов Л. Д. Искусство Древней Руси : Кн. для чтения. Москва: Просвещение, 1974. С. 295–336.

Платонов С. Ф. Смутное время. Очерки истории внутреннего кризиса и общественной борьбы в Московском государстве в XVI–XVII вв. С.-Петербург, 1910. 648 с.

Поссевино А. Исторические сочинения о России XVII в. / Пер. с лат. Москва: Изд-во МГУ, 1983. 272 с.

Творогов О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 106–124.

Andrusiewicz, A. Dzieje Dymitriad: 1602–1614. T. 1: Nadzieje i oczekiwania. Warszawa: Akademia Nauk Społecznych. Wyd-wo Naukowe, 1990. 335 s.

Andrusiewicz, A. Dzieje Dymitriad: 1602–1614. T. 2: Na rozdrożu dziejów. Warszawa: Akademia Nauk Społecznych. Wyd-wo Naukowe, 1990. 367 s.

## VII. Расійская імперыя ў XVIII – пачатку XX ст.

Паўночная вайна: яе ход і вынікі. Першыя спробы правядзення рэформаў пры кіраванні Фёдара Аляксеевіча і Соф'і Аляксееўны. Рэформы Пятра I і іх вытокі. Рэформа органаў кіравання, узмацненне абсалютызму. Вайсковая рэформа. Эканамічная палітыка Пятра I. Сацыяльныя навацыі. Царкоўная рэформа. Абвяшчэнне Расійскай імперыі. Сацыяльны кошт рэформаў Пятра I, іх пераважна гвалтоўны характар. Сацыяльныя рухі падчас уладарання Пятра I.

Эпоха палацавых пераваротаў (1725–1762 гг.). Цараванне Пятра II. Прыход да ўлады Ганны Іванаўны і яе фаварыта Эрнста Ёгана Бірона. Узыходжанне на трон Лізаветы Пятроўны.

Цараванне Пятра III, Кацярыны II, Паўла I; рэфармаванне дзяржаўных устаноў і гаспадаркі. Паўстанне Емяльяна Пугачова.

Захопніцкая знешняя палітыка. Экспансія Расійскай імперыі ў ВКЛ, Украіне, у Прычарнамор'і, паўночнай Еўразіі, на Каўказе. Расійска-турэцкія войны.

Культура і навука Расіі ў XVIII ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст.

Спробы ліберальных пераўтварэнняў за часоў Аляксандра I і іх вынікі. Войны з Напалеонам. Вайна са Швецыяй і захоп Расіяй Фінляндыі. Царства Польскае ў складзе Расійскай імперыі. Пачаткі апазіцыйных рухаў: таемныя таварыствы; дзекабрысты і іх выступленне ў 1825 г.

Унутраная палітыка Мікалая I. Сялянская рэформа графа Пятра Кісялёва. Грашовая рэформа Георга Людвіга Канкрына. Стварэнне Мануфактурнага савета. Далейшае ўмацаванне самадзяржаўя: узмацненне ролі імператарская канцылярыі і яе III аддзялення. Новыя цэнзурныя статуты. Дзейнасць міністэрства саветы на чале з Сяргеем Уваравым.

Знешняя палітыка імперыі за часоў Аляксандра I і Мікалая I.

Падаўленні паўстанняў у Польшчы, Літве, Беларусі. Крымская вайна (1853–1856 гг.) і яе вынікі.

Спробы рэформаў за часоў Аляксандра II. Фармальнае скасаванне прыгоннага права. Земская, судовая і вайсковая рэформы. Рэформы ў галінах гарадскога самакіравання, фінансаў, народнай асветы, цэнзуры. Ацэнкі вынікаў гэтых рэформаў.

Знешняя палітыка Аляксандра II і Аляксандра III. Змаганне за перагляд вынікаў Крымскай вайны, умацаванне расійскіх пазіцый на Блізкім Усходзе і на Балканах. Захоп імперыяй новых тэрыторый у Сярэдняй Азіі, Закаўказзі, на Далёкім Усходзе.

Унутраная палітыка Аляксандра III («час контррэформаў»). Асаблівасці эканамічнага развіцця Расіі ў гэты перыяд.

Грамадска-палітычныя плыні і тэрарыстычныя арганізацыі 1860-х – 1890-х гг.

Культура і навука Расіі ў XIX ст.

Прыход да ўлады імператара Мікалая II. Расійская імперыя на мяжы XIX і XX стст.: сацыяльная структура грамадства, асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сталыпінская аграрная рэформа.

Палітычнае жыццё Расіі. Расійска-японская вайна. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.: яе пазітыўныя вынікі і адмоўныя наступствы (імперыя паміж дзвюма рэвалюцыямі).Знешняя палітыка Расійскай імперыі ў 1900–1917 гг. Расія ў Першай сусветнай вайне. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.

Культура Расіі ў пачатку XX ст.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Аднадворцы*** – ваенізаваныя землеўласнікі-сяляне, якія адначасова з заняткам сельскай гаспадаркай неслі ахову паўднёвых межаў Расійскай імперыі.

***Адыходнікі*** – сяляне, якія былі змушаныя адыходзіць на заробкі ў іншыя мясцовасці.

***Акцябрысты («Союз 17 Октября»)*** – руская палітычная партыя памешчыкаў і буйных прадпрымальнікаў, якая прапаведавала ідэю моцнай манархічнай улады пры адначасным атрыманні ад імператара пэўных дэмакратычных свабодаў. Лідарамі партыі былі Аляксандр Гучкоў, Міхаіл Радзянка і інш. У Дзярждуме ІІ склікання колькасць фракцыі акцябрыстаў дасягала 154 чалавек, пазней яна змяншалася.

***Антанта*** – саюзны блок Вялікабрытаніі, Францыі і Расіі, які склаўся ў 1904–1907 гг., а падчас Першай сусветнай вайны аб’яднаў больш за 20 дзяржаў, у т. л. ЗША, Італію, Японію. Яго моц была ў пэўнай ступені падарваная ў выніку цеснага супрацоўніцтва расійскіх бальшавікоў з Германскай імперыяй.

***Аракчэеўшчына*** – у часы ўладарання Аляксандра І палітыка вайсковага міністра графа Аляксея Аракчэева, якая грунтавалася на інтэнсіўным стварэнні *вайсковых паселішчаў* – асаблівай арганізацыі ўзброеных сілаў, пры якой служба ў страі сумяшчалася з заняткам гаспадаркай.

***Бульбяныя бунты*** – масавыя хваляванні дзяржаўных і ўдзельных сялян у Расіі ў 1830-х гг., выкліканыя прымусовым увядзеннем пасадкі бульбы.

***Бурмістр*** – пасаджаны царом (пачынаючы ад Пятра І) кіраўнік горада, падпарадкаваны бурмістарскай палаце.

***«Бутурлінскі камітэт»*** – найвышэйшы орган царскай цэнзуры, які існаваў у часы ўладарання Мікалая І, у 1848–1855 гг.

***Валасное праўленне*** – орган сялянскага мясцовага самакіравання, які складаўся з валаснога старшыні, сельскіх старастаў. З’явіўся ў другой палове ХІХ ст.

***Водруб*** – у пачатку ХХ ст. зямельны ўчастак вылучаны з абшчыннай зямлі ў аднаасобную сялянскую ўласнасць.

***Вольныя аратыя («хлебопашцы»)*** – сяляне, вызваленыя (пасля 1803 г.) з прыгону на аснове добраахвотнага пагаднення з памешчыкамі.

***Вялікі князь*** – прыватны родавы тытул членаў расійскай імператарскай сям'і.

***Вярхоўны таемны савет*** – найвышэйшы дарадчы орган у Расіі (1726–1730 гг.), які складаўся з 7–8 асоб.

***Газават*** – свяшчэнная вайна горцаў-мусульман супраць расійскіх іншаверцаў у 1817–1864 гг., на чале якой доўгі час стаяў Шаміль.

***Гараднічы*** – галава адміністрацыйнай улады ў Расіі на ўзроўні ўезду (павету). Пасада існавала да 1862 г.

***Генерал-губернатар*** – найвышэйшага рангу службовая асоба ў Расійскай імперыі, якая валодала вайсковай і цывільнай уладай на тэрыторыі адной або некалькіх губерняў.

***Граф*** – дваранскі тытул у Расіі, устаноўлены Пятром І. Усяго было вызначана больш за 300 графскіх родаў.

***Грэнадзёры*** – з часоў Пятра І адборныя пяхотныя роты (пазней – палкі) у расійскай арміі.

***Губерня*** – з 1708 г. галоўная адміністрацыйная адзінка тэрыторыі Расіі, якая падзялялася на ўезды (паветы).

***Дарнікі («дарственники»)*** – былыя прыгонныя сяляне, якія пасля рэформы 1861 г. атрымалі зямельны надзел у якасці дару.

***Дзекабрысты*** – удзельнікі дваранскага рэвалюцыйнага руху ў Расіі, якія зрабілі спробу ўзброенага выступлення на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу 14 снежня 1825 г., спрабуючы выкарыстаць момант «міжцаравання» ў краіне. Ідэі дзекабрыстаў фарміраваліся ў таемных Паўночным і Паўднёвым таварыствах. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтых таварыстваў былі Мікіта Мураўёў, Мікалай Тургенеў, Кандрат Рылееў, Яўгеній Абаленскі, Павел Пестэль, Сяргей Мураўёў-Апостал і інш.

***Дзяржаўная Дума*** – законапрадстаўнічая, дарадчая ўстанова ў Расійскай імперыі ў 1906–1917 гг. (чатыры скліканні). Разглядала праекты законаў, якія потым абмяркоўваліся ў Дзяржаўным Савеце і зацвярджаліся імператарам.

***Дзяржаўны Савет*** – найвышэйшы дарадчы орган пры імператару Расійскай імперыі, які існаваў у 1810–1917 гг. і разглядаў законапраекты перад вынясеннем іх на зацвярджэнне апошняму. З утварэннем Дзярждумы палова Дзяржсавета прызначалася імператарам, другая паловы была выбарнай.

***Дзяржаўныя (казённыя) сяляне*** – з XVIII ст. былыя чарнасошныя сяляне і сяляне-аднадворцы. Жылі на дзяржаўных землях, выконвалі павіннасці на карысць дзяржавы, але лічыліся асабіста свабоднымі.

***«Заходнікі»*** – прадстаўнікі напрамку расійскай грамадска-палітычнай думкі, якія стаялі за шлях развіцця краіны паводле заходнееўрапейскіх узораў. Ім супрацьстаялі і жорстка іх крытыкавалі т. зв. «славянафілы».

***Земствы*** – выбарныя саслоўныя органы мясцовага самакіравання (земскія сходы і земскія ўправы), створаныя ў Расіі ў выніку земскай рэформы 1864 г.

***Кадэты*** – гутарковая назва членаў створанай у 1905 г. рускай партыі канстытуцыйных дэмакратаў. Самымі ўплывовымі лідарамі гэтай партыі былі Пётр Мілюкоў і Пётр Струвэ.

***Калегіі*** – органы цэнтральнага галіновага кіравання, створаныя ў 1718 г. Пятром I замест прыказаў.

***«Кандыцыі»*** – умовы, выстаўленыя Ганне Іванаўне ў 1730 г. пры запрашэнні яе заняць расійскі трон. Стаўшы імператрыцай, яна адмовілася выконваць большасць «кандыцый».

***Крывавая нядзеля*** – дзень 9 (22) снежня 1905 г., калі ў Пецярбургу ўрадавымі войскамі была расстраляная мірная рабочая дэманстрацыя. Лічыцца днём пачатку рэвалюцыі 1905 г. у Расіі.

***Купчая зямля*** – зямельныя ўчасткі, купленыя сялянамі звыш вызначанага памеру надзела. Былі ўласнасцю адпаведных сялян без якіх-небудзь абмежаванняў.

***Курыя*** – разрад выбаршчыкаў, вызначаны паводле маёмаснай, нацыянальнай або іншай прыкметы.

***Магістраты*** – саслоўныя органы мясцовага самакіравання, створаныя ў 1720-х гг. для вырашэння судовых, паліцэйскіх, фінансавых пытанняў (нейкі час называліся таксама ратушамі), У 1775 г. былі пераўтвораныя ў суды для гарадскіх саслоўяў. Ліквідаваныя пасля судовай рэформы 1864 г.

***Маёнтак*** – зямельны ўчастак з сядзібай.

***Манастырскія сяляне*** – сяляне, якія належалі манастырам. У сярэдзіне XVIII ст. колькасць такіх сялян-мужчын складала агулам каля 900 тыс. чалавек. Пазней утварылі катэгорыю эканамічных сялян.

***Месячына*** – шасцідзённая паншчына прыгонных сялян, пазбаўленых сваіх надзелаў, за месячны харчовы паёк, фактычна форма нявольніцтва. Існавала ў XVIII – першай палове XIX ст.

***Міравы суд*** – найніжэйшае звяно расійскай судовай сістэмы, створанае пасля судовай рэформы 1864 г.

***Мяшчане*** – падатнае саслоўе ў Расійскай імперыі, былыя пасадскія людзі – рамеснікі, дробныя гандляры і домаўласнікі.

***Намесніцтва*** – у апошняй чвэрці XVIII ст. адміністрацыйная адзінка ў Расійскай імперыі, якая складалася з дзвюх-трох губерняў.

***Народніцтва*** – ідэалогія антыцарскага руху разначыннай расійскай інтэлігенцыі, якая прапаведавала ідэю вызвалення Расіі праз сялянскую рэвалюцыю і фактычна адмаўляла капіталістычныя адносіны. Ідэйнымі натхняльнікамі руху былі літаратары Аляксандр Герцэн і Мікалай Чарнышэўскі. Самай уплывовай народніцкай арганізацыяй была «Народная воля», якая існавала з 1879 г. і здолела ў 1881 г. арганізаваць забойства імператара Аляксандра II. Другая арганізацыя, «Чорны перадзел» (існавала ў 1879–1881 гг.), прапагандавала збольшага мірныя метады барацьбы з самадзяржаўем.

***Негалосны камітэт*** – кола ліберальна настроеных сяброў

і дарадцаў Аляксандра І, у якое ўваходзілі графы Павел Строганаў, Віктар Качубей, Мікалай Навасільцаў, князь Адам Чартарыйскі. Дзейнічаў у 1801–1803 гг.

***Нігілізм*** – папулярная сярод часткі расійскай моладзі сярэдзіны XIX ст. ідэалогія суцэльнага адмаўлення існуючага дзяржаўнага ўладкавання, маралі, нормаў паводзінаў.

***Обер-пракурор*** – у Расійскай імперыі высокі чыноўнік, які ўзначальваў Сінод, а таксама начальнік канцылярыі Сената.

***Падатныя саслоўі*** – сяляне і мяшчане, якія плацілі падушныя падаткі, выконвалі рэкруцкую і іншыя павіннасці.

***Пасесійныя сяляне*** – у XVIII – першай палове XIX ст. сяляне, якія накіроўваліся на працу на мануфактурах і маглі надалей быць прададзеныя толькі разам з імі.

***Петрашэўцы*** – гурток разначыннай расійскай моладзі (1844 – пачатак 1849 г.), якая захаплялася ўтапічна-сацыялістычнымі поглядамі. Быў выкрыты царскімі следчымі, шмат хто з актывістаў быў адпраўлены ў высылку.

***Разначынцы*** – выхадцы з розных, звычайна недваранскіх, саслоўяў, якія займаліся разумовай працай і былі носьбітамі дэмакратычных ідэалогій.

***Рэкруты*** – асобы з падатных саслоўяў, якія прымаліся на вайсковую службу паводле найму або павіннасці. Рэкруцкая павіннасць напачатку была пажыццёвай, але ў 1793 г. была скарочана да 25 гадоў.

***Сакрэтныя камітэты*** – часовыя дарадчыя органы, якія ствараліся ў Расіі ў першай палове XIX ст. Займаліся ў тым ліку і пытаннямі аграрнай рэформы, магчымай адмены прыгоннага права.

***Сацыял-дэмакраты*** – прадстаўнікі Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), а таксама адпаведнай партыі Польшчы і Літвы. Існавала таксама габрэйская сацыял-дэмакратычная партыя. Сацыял-дэмакарты выступалі за звяржэнне самадзяржаўя, 8-гадзінны працоўны дзень,

права народаў Расіі на самавызначэнне, адмену або абмежаванне прыватнай уласнасці, найперш на зямлю.

РСДРП фармальна ўтварылася ў 1898 г. на з’ездзе ў Мінску. Далейшыя яе з’езды праходзілі за межамі Расійскай імперыі. У 1903 г. партыя раскалолася на плыні бальшавікоў і меншавікоў. Падчас Першай сусветнай вайны бальшавікі чакалі паразы сваёй імперыі, меншавікі стаялі ан пазіцыях «абарончай вайны». Лідарам бальшавікоў быў Уладзімір Ленін, у 1917 г. да яго далучыўся Леў Троцкі; меншавікоў узначальвалі Юлій Мартаў, Георгій Пляханаў, Карло Чхеідзэ, Фёдар Дан.

***Сацыялісты-рэвалюцыянера (эсэры)*** – найбуйнейшая расійская палітычная партыя ў 1901–1917 гг., якая ўзнікла на аснове ранейшых народніцкіх арганізацый. Дзейнічала нелегальна, бо прызнавала тэрор як сродак эфектыўнай палітычнай барацьбы. Распрацавала праграму надзялення зямлёй сялян і розных дэмакратычных пераўтварэнняў. Лідарамі партыі былі Віктар Чарноў, Рыгор Гершуні, Андрэй Аргуноў, Барыс Савінкаў, Абрам і і Міхаіл Гоцы.

***Сенат*** – найвышэйшы орган кіравання Расіі, створаны Пятром I у 1711 г. Спачатку функцыянаваў як орган калектыўнага кіравання пры адсутнасці цара, пазней стаў заканадаўчым органам і судовай інстанцыяй. Рэформу Сената, падзел яго на дэпартаменты правяла Кацярына II. З 1782 г. Сенат існаваў як найвышэйшы судовы орган.

***Сінод*** – найвышэйшы орган кіравання расійскай праваслаўнай царквой, заснаваны Пятром I пасля скасавання пасады патрыярха.

***Табель аб рангах*** – закон, зацверджаны Пятром I у 1722 г., згодна з якім у Расійскай імперыі ўводзілася 14 рангаў (чыноў) дзяржаўнай службы – вайсковай, цывільнай і прыдворнай.

***Таемная канцыялярыя*** – орган палітычнага нагляду і вышуку, створаны Пятром I, а пасля яго смерці ўзноўлены

імператрыцамі Ганнай Іванаўнай і Лізаветай Пятроўнай. У 1762–1801 гг. існаваў як дэпартамент Сената пад назвай «таемная экспедыцыя».

***Трэцяліпеньская манархія*** – уведзены 3 ліпеня 1907 г. з парушэннем дзейных законаў новы парадак кіравання Расіяй, які пачаўся з роспуску другой Дзярждумы.

***Удзельныя землі*** – зямельная ўласнасць расійскай імператарскай сям'і, створаная ў 1797 г. з ранейшых палацавых земляў.

***Удзельныя сяляне*** – катэгорыя залежных сялян у Расіі, якія працавалі на ўдзельных землях, плацілі аброк і выконвалі дзяржаўныя павіннасці.

***Улажэнскія («уложенные») камісіі*** – часовыя калегіяльныя органы, якія ствараліся ў XVIII ст. дзеля кадыфікацыі законаў, што былі прынятыя і пачалі дзейнічаць пасля прыняцця Саборнага Улажэння ў 1649 г.

***Хутар*** – зямельны ўчастак, выдзелены селяніну пры выхадзе яго з абшчыны, на які ён перасяляецца з вёскі.

***Часоваабавязаныя сяляне*** – былыя памешчыцкія сяляне, вызваленыя ад прыгону ў 1861 г., але не пераведзеныя на выкупныя выплаты. За карыстанне зямлёй яны мусілі выконваць пэўныя павіннасці.

***Шасцігалосныя думы*** – выканаўчыя органы гарадскога самакіравання, які існаваў у Расіі ў 1785–1880 гг., якія займаліся пытаннямі гарадскога добраўпарадкавання.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

Алленов М. Русское искусство XVIII – начала XX века. Москва: Трилистник, 2000. 320 с.

Анисимов Е. В. Россия без Петра. С.-Петербург: Лениздат, 1994. 496 с.

Анисимов Е. В. Время петровских реформ. Ленинград: Лениздат, 1989. 496 с.

Анчиполовский З. Я. Люди русского театра. Воронеж: Центр.-Чернозем. кн. изд-во, 1983. 216 с.

Заичкин И. А., Почкаев И. Н. Русская история. От Екатерины Великой до Александра II. Москва: Мысль, 1994. 765 с.

Карлов В. В. Введение в этнографию народов СССР. Москва: Изд-во МГУ, 1990. 160 с.

Корнилов А. А. Курс истории России XIX века. Москва: Высшая школа, 1993. 447 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII–XVIII стагоддзі. Мн.: Беларусь, 2010. С. 133–171.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Рускае і беларускае мастацтва XIX – пачатку XX стагоддзя. Мн.: Беларусь, 2011. 548 с.

Ливанова Т. Н. Русская музыкальная культура XVIII века в ее связях с литературой, театром и бытом. Исследования и материалы. Т. 1. Москва: Музгиз, 1952. 536 с.; Т. 2. Москва: Музгиз, 1953. 476 с.

Миронов Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.). С.-Петербург: «Дмитрий Буланин», 2000. Т. 1: 548 с.; Т. 2: 568 с.

Мыльников А. С. Искушение чудом. Русский принц и самозванцы. С.-Петербург: Наука, 1990. 272 с.

Немцы в истории России: Документы высших органов власти и военного командования. 1652–1917 / Сост. В. Ф. Дизендорф. Москва: Материк, 2006. 784 с.

Павленко Н. Вокруг трона. Москва: Мысль, 1999. 864 с.

Российские государи. Их происхождение, интимная жизнь и политика. Москва: Новости, 1993. 544 с.

Русское искусство барокко / авт.-сост: М. Алексеева, И. Уханова, Ю. Аренкова, Н. Калязина. Москва: Наука, 1977. 240 с.

Третьякова Л. С. Русская музыка XIX века: книга для учащихся старших классов. Москва: Просвещение, 1976. 205 с.

Три века: От Смуты до нашего времени. / Под ред. В В. Каллаша. Москва:

Юнвес, 2006. Т 3: 320 с., Т. 4: 384 с., Т. 5: 384 с., Т. 6: 416 с.

Художественная культура. XVIII – начало XXI века: Пособие. Авт.-сост. С. Ю. Лебедев. Мн.: Дизайн ПРО, 2007. С. 26–40, 77–83, 95–108, 123–143, 179–198, 259–262.

Черкасов П., Чернышевский Д. История Императорской России от Петра Великого до Николая II. Москва:Международные отношения, 1994. 448 с.

Cracraft, J. The Revolution of Peter the Great. Harvard University Press, 2003. 240 p.

Fuller, William C. Strategy and Power in Russia. 1600–1914. N. Y.: Simon&Schuster, 1998. 576 p.

Seton-Watson, H. The Russian Empire 1801–1917. (Oxford History of Modern Europe). Oxford: Clarendon Press, 1988. 813 p.

## VIII. Асаблівасці ўзнікнення і эвалюцыя Расійскай імперыі (падагульненне)

Працэс фарміравання Расійскай імперыі як імперыі азіяцкага тыпу і яго асноўныя асаблівасці. Спосабы падпарадкавання і падаўлення мясцовых эліт. Палітыка імперыі ў галіне культуры. Моўная палітыка Расійскай імперыі ў гістарычным развіцці. Этнічныя працэсы, фарміраванне сучасных нацый і перадумовы першага распаду Расійскай імперыі.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Асіміляцыя*** – зліццё, прыпадабленне прысвойванне; уліццё аднаго народа ў іншы, мацнейшы, якое цягне за сабой страту першым сваёй мовы, культуры, нацыянальнай свядомасці.

***Імперыя*** – тэрытарыяльна вялікая, цэнтралізаваная і іерархізаваная поліэтнічная дзяржава, звычайна манархічнага або таталітарнага тыпу, у якой падаўляецца дзейнасць адцэнтрабежных сілаў. Ствараецца шляхам падпарадкавання раней незалежных народаў, подкупу і/або запалохвання мясцовых эліт.

***Нацыя*** – сфармаванае ў нетрах этнічнай супольнасці ўстойлівае сацыяльна-палітычнае ўтварэнне фармацыйнага характару, якое праз гістарычную, моўна-культурную агульнасць і рынкавыя адносіны яднае большую частку насельніцтва пэўнай этнічнай супольнасці.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


Бутуліс І., Зунда А. Гісторыя Латвіі / пер. з латышск. Мн.: Зміцер Колас, 2017. С. 55–64, 78–87.

Гісторыя Беларусі. Т 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі / аўт: М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч, А. Філатава і інш. Мн.: Экаперспектыва, 2005. С. 67–74, 94–102, 269–291, 401–433.

Карлов В. В. Введение в этнографию народов СССР. (Стадийные закономерности и локально-исторические особенности этнокультурных процессов в XIX–XX вв. Москва: Изд-во Моск. университета, 1990. С. 43–120, 130–133.

Крип'якевич І. П. Історія України. Львів: Світ, 1990. С. 294–298.

Магун А. В. Империализация (Понятие империи и современный мир) // Полис. Политические исследования. 2007. № 2. С. 63–80.

Мейнандэр Х. Гісторыя Фінляндыі: лініі структуры, пераломныя моманты / пер.са шведскай. Мн.: Маст. літ., 2017. С. 83–87, 94–97.

Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа: X–XXI стст. / Рэд. і ўкл. тэксту: М. Семаковіч; пер. з польск. Выд. 3-е. Варшава: DEMART, 2007. С. 122–125, 144–145, 151–153, 161–163.

Рерих Ю. Н. История Средней Азии. Москва: Междун. Центр Рерихов, 2004. 472 с.

Российский Кавказ: книга для политиков / под ред. В. А. Тишкова. Москва: Росинформагротех, 2007. С. 73–103.

Сибирь в составе Российской Империи / отв. ред. Дамешек Л. М, Ремнев А. В. Москва: Новое литературное обозрение, 2007. 368 с.

Сміт Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / пер. з англ. Мн.: БФС, 1995. С. 11–14.

Федотов Г. П. Судьба и грехи России. Киев: София, 1991. 704 с.
Хоскинг Дж. Россия: народ и империя (1552–1917) / Пер с англ. Смоленск: Русич, 2000. 512 с.
Эйдзінтас ЭА., Бумблаўскас А. і інш. Гісторыя Літвы / пер. з літ. Вільня: SANTARA, 2014. С. 99–129.
Allworth, E. (ed.). Central Asia: A Century Of Russian Rule. Columbia Univ. Press, 1967. 552 p.
Hobsbawm, E. J. Nations and Nationalism since 1780. 2nd ed. Cambridge University Press, 1992. 206 p.
Kappeler, A. Rußland als Vielvölkerreich: Entstehung, Geschichte, Zerfall. München: C. H. Beck, 2008. 416 S.

## IX. Лютаўская рэвалюцыя. Кастрычніцкі пераварот. Савецкая Расія і залежныя ад яе краіны (1917–1991 гг.)

Стварэнне Часовага ўрада на чале з Георгіем Львовым. Наступныя склады Часовага ўрады і іх палітыка. Аляксандр Керанскі. Дзейнасць саветаў сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў, палітычных партый Расіі. Распад старой імперскай структуры. Карнілаўскі путч. Кастрычніцкі пераварот 1917 г., абставіны прыходу да ўлады бальшавікоў. Разгон бальшавікамі Устаноўчага сходу. Грамадзянская вайна, іншаземная інтэрвенцыя на тэрыторыі Расіі, бальшавіцка-польская вайна і іх вынікі. «Чырвоны» і «белы» тэрор.

Неакаланіялізм бальшавіцкіх уладароў. Стварэнне новай імперскай структуры – СССР.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Савецкай Расіі ў 20-я гады XX ст. Змаганне бальшавікоў з усімі відамі палітычнай і духоўнай апазіцыі. Знешняя палітыка позняленінскай і раннясталінскай Расіі. Культура і навука Савецкай Расіі ў 1920-х гг.

Сталінская мадэрнізацыя і бальшавіцкі тэрор у 1930-я гг. Фізічнае вынішчэнне старой рускай і іншанацыянальных эліт.

Экспансіянісцкі характар знешняй палітыкі Савецкай Расіі ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі; умяшанне ў грамадзянскія войны ў Іспаніі і Кітаі; узброеныя канфлікты з Японіяй; «зімовая вайна» супраць Фінляндыі і яе вынікі.

Умовы развіцця культуры і навукі Савецкай Расіі ў 30-я гг. XX ст.

Савецкая Расія і залежныя ад яе краіны падчас Другой сусветнай вайны: перадумовы і пачатак вайны; саюзніцкія адносіны з нацысцкай Германіяй на першым яе этапе. Раздзел Польшчы. Акупацыя Савецкім Саюзам краін Балтыі і Бесарабіі. Паварот у ходзе вайны: напад нацысцкай Германіі і яе сатэлітаў на СССР; цяжкія паразы Чырвонай Арміі на першым этапе савецка-нацысцкай вайны. Фарміраванне антыгітлераўскай кааліцыі і карэнны пералом у баявых дзеяннях на Усходнім фронце нацыстаў. Заключны перыяд Другой сусветнай вайны. Разгром і капітуляцыя нацысцкай Германіі. Параза Японіі ў баявых дзеяннях у Паўднёва-Усходняй Азіі.

Тупіковая эвалюцыя сталінскага рэжыму (1946–1953 гг.): сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Савецкай Расіі і залежных ад яе краінах. Халодная вайна.

Пасляваеннае ўладкаванне свету; знешняя палітыка савецкай імперыі позняcталінскага часу.

Культура і навука Савецкай Расіі ў 1940-я – пачатку 1950-х гг.

Крызіс камуністычна-савецкай сістэмы ў 1953–1985 гг. Хрушчоўская «адліга» і брэжнеўская «стагнацыя». Эканамічныя крызісы і спробы рэформаў. Дзейнасць савецкіх спецслужбаў па здушванні нацыянальных эліт.

Знешняя палітыка крамлёўскіх уладароў;. узброеныя і дыпламатычныя ўмяшанні ў палітычныя працэсы ў ГДР, Венгрыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Афганістане і іншых краінах свету; палітычны і ваенны канфлікт з Кітаем.

Спробы духоўнага супраціву камуністычнай уладзе ў часы «стагнацыі»

Культура і навука Савецкай Расіі ў 1953–1985 гг.

Андропаўска-чарненкаўскае «міжцараванне»; прыход да ўлады Міхаіла Гарбачова; пачатак палітыкі «паскарэння», «галоснасці», «перабудовы». – Пачаткі дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў Савецкай Расіі і залежных ад яе краінах; спробы суверэнізацыі Расіі пасля абрання яе першага прэзідэнта Барыса Ельцына. Жнівеньскі путч 1991 г. у Маскве і яго вынікі. Крызіс палітыкі «перабудовы» і яго прычыны. Распад савецкай імперыі і яго прычыны і перадумовы.

Дасягненні культурнага жыцця Савецкай Расіі ў 1985–1991 гг.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Апазіцыя*** – групоўка асоб, не згодных з афіцыйнай дзяржаўнай палітыкай.

***Бальшавікі*** – удзельнікі палітычных груповак радыкальнага напрамку, якія выступалі ў гісторыі пад назвамі Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі (бальшавікоў), Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў), Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (КПСС). Мэтай дзейнасці гэтых груповак была поўная манапалізацыя і бестэрміновае ўтрыманне ў сваіх руках палітычнай улады ў Расіі і падкантрольных ёй краінах, элімінацыя любых палітычных апанентаў з выкарыстаннем неабмежаванай прапаганды, маніпулявання грамадскай свядомасцю, а пры неабходнасці з дапамогай тэрору і фізічнага вынішчэння. Лідарамі бальшавіцкай групоўкі былі Уладзімір Ленін і Іосіф Сталін. Пазнейшыя кіраўнікі (Мікіта Хрушчоў, Леанід Брэжнеў) удасканальвалі метады тэрору праз яго «кропкавае» ўжыванне.

***Бюракратыя*** – праслойка грамадства, прадстаўнікі якой належаць да найвышэйшай чыноўніцкай адміністрацыі; у недэмакратычных дзяржавах бюракратыя трымае ў сваіх

руках вырашэнне практычна ўсіх канкрэтных жыццёвых пытанняў грамадзян.

***Ваенна-прамысловы комплекс (ВПК)*** – саюз сістэмы нацыянальнай ваеннай вытворчасці і палітычных сілаў, зацікаўленых у яе прыярытэтным развіцці.

***Вялікая Айчынная вайна*** – прынятае ў савецкай і сучаснай расійскай гістарычнай літаратуры абазначэнне перыяду Другой сусветнай вайны пасля нападу Гітлера на Савецкі саюз і перапыненне саюзніцкіх адносінаў паміж Гітлерам і Сталіным (чэрвень 1941 – травень 1945 гг.).

***Грамадзянская вайна ў Расіі*** – арганізаванае ўзброенае змаганне за ўладу, якое вялося ў 1918–1923 гг. па ўсёй краіне і ў асобных яе рэгіёнах паміж рознымі групоўкамі.

***ГУЛаг*** – руская абрэвіятура назвы «Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў». Гэты орган быў створаны па рашэнні бальшавікоў дзеля забеспячэння магчымасцяў арганізацыі паднявольнай працы ў Савецкім Саюзе і афіцыйна функцыянаваў у 1934–1956 гг.

***Камунізм*** – утапічная мадэль «бяскласавага грамадства будучыні», кожны ўдзельнік якога будзе працаваць без эканамічных стымулаў. Была прыдуманая нямецкімі мыслярамі Карлам Марксам і Фрыдрыхам Энгельсам.

***Дыктатура*** – улада, не абмежаваная і не звязаная ніякімі законамі, прынятымі легітымнымі органамі, якая забяспечвае палітычнае панаванне той або іншай палітычнай групоўцы, а таксама спосаб забеспячэння гэтай улады, палітычны рэжым.

***Дэпартацыя*** – прымусовае перасяленне карэннага насельніцтва пэўнай тэрыторыі з ідэалагічных або палітычных прычын.

***Калгасы і саўгасы*** – бальшавіцкія структуры новага запрыгоньвання сялян. Ствараліся, пачынаючы з канца 1920-х гг. гвалтоўнымі метадамі праз адбіранне ў сялян зямлі і інвен-

тару пад выглядам «калектывізацыі сельскай гаспадаркі». Да сярэдзіны 1960-х гг. калгаснікі былі пазбаўленыя права атрымоўваць грашовае ўзнагароджанне за сваю працу і дзяржаўныя пенсіі.

***Калабарацыя*** – добраахвотнае супрацоўніцтва з іншаземнымі акупантамі.

***Камсамол*** – структура, створаная бальшавіцкай групоўкай у 1918 г. дзеля прапагандавання сваіх метадаў кіравання сярод часткі моладзі і ажыццяўлення палітычнага кантролю над усёй моладдзю Расіі і залежных ад яе краін.

***Кантрыбуцыя*** – прымусовыя плацяжы, якія спаганяюцца пасля заканчэння вайны краінамі-пераможцамі з пераможаных краін.

***Канцэсія*** – дамова аб перадачы на пэўны тэрмін прыналежных пэўнай дзяржаве прыродных багаццяў або гаспадарчых аб’ектаў.

***«Культ асобы»*** – прыдуманая постбальшавіцкімі камуністамі метафара для тлумачэння тэрору, арганізаванага ў Расіі і залежных ад яе краінах Сталіным і яго памагатымі.

***Латышскія стралкі*** – прафесійныя вайскоўцы былой расійскай арміі латышскага паходжання, якія ў першы час існавання бальшавіцкай улады забяспечвалі неабходны мінімум вайсковай сілы для ўтрымання яе маскоўскай кіроўнай групоўкай. Большасць іх была фізічна знішчана падчас сталінска-бальшавіцкага тэрору.

***«Левыя эсэры»*** – адзіная палітычная групоўка на тэрыторыі былой імператарскай Расіі, якой бальшавікі пасля захопу ўлады дазвалялі легальна дзейнічаць да сярэдзіны 1918 г., калі яны ўваходзілі таксама ў склад урада Леніна, і на кароткі тэрмін у пачатку 1920-х гг. Лідарамі групоўкі былі Марыя Спірыдонава, Марк Натансон, Ісак Штэйнберг.

***Народныя камісарыяты («наркаматы»)*** – структуры галіновага дзяржаўнага кіравання у бальшавіцкіх урадах; у 1946 г. былі ператвораныя ў міністэрствы.

***Наменклатура партыйная*** – у савецкі час вызначаны бальшавіцкімі ўладамі пералік , асоб, якія рэкамендуюцца для заняцця партыйна-дзяржаўных пасадаў.

***НЭП («новая эканамічная палітыка»*** – палітыка вымушаных саступак бальшавіцкай групоўкі сялянам на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, абвешчаная ў 1921 г. Сутнасць НЭПу палягала ў замене гвалтоўнай «харчразвёрсткі» на харчовы падатак, дзякуючы якому селянін атрымоўваў магчымасць сам распараджацца рэшткамі выробленай ім сельгаспрадукцыі. Гэтыя крокі ўлады змусілі яе пагадзіцца таксама на абмежаванае функцыянаванне прыватнай уласнасці ў іншых сферах эканомікі. Гэтая палітыка была згорнутая пасля абвяшчэння палітыкі «калектывізацыі сельскай гаспадаркі» ў канцы 1920-х гг.

***Палітбюро (у пэўны перыяд – прэзідыум) Цэнтральнага камітэта (ЦК)*** – назва калектыўнага дарадчага органа бальшавіцкай партыі, на пасяджэннях якога абмяркоўваліся найважнейшыя пытанні ажыццяўлення ўлады бальшавікоў у Расіі і залежных ад яе краінах.

***«Перабудова» («перестройка»)*** – новы курс, абвешчаны кіраўніком расійскіх камуністаў Міхаілам Гарбачовым у другой палове 1980-х гг., паводле якога кіроўны рэжым, на фоне сур’ёзнага сацыяльнага і эканамічнага крызісу, павінен быў стварыць прыкметы ўнутрана- і знешнепалітычнай легітымізацыі. Палітыка пацярпела крах у сувязі з адарванасцю камуністычных функцыянераў ад рэалій жыцця народаў Савецкай імперыі.

***Путч*** – дзяржаўны пераварот або яго спроба.

***Руская вызвольная армія*** – назва вайсковых злучэнняў т. зв. «Камітэта вызвалення народаў Расіі», створаных пад кантролем нацысцкай Германіі дзеля змагання з бальшавікамі, на чале з былым савецкім генералам Андрэем Уласавым.

***Рэабілітацыя*** – вяртанне правоў і добрага імя раней рэпрэсаваным або інакш пакараным асобам.

***Савет народных камісараў*** – назва бальшавіцкіх урадаў да 1946 г. Пазней перайменаваны ў Савет міністраў.

***Савецкая ўлада*** – сістэма структур у Расіі і залежных ад яе краінах, якая была створана для фармальнага прыкрыцця рэальнай улады бальшавіцкай і постбальшавіцкай палітычнай групоўкі. Выбары ў саветы арганізоўваліся на безальтэрнатыўнай аснове пад поўным кантролем названай групоўкі. Фармальна найвышэйшымі органамі гэтай сістэмы з'яўляліся цэнтральныя выканаўчыя камітэты (пазней – Вярхоўныя саветы) Расіі і залежных ад яе «саюзных рэспублік», якія дапаўняліся губернскімі (пазней – абласнымі), уезнымі (пазней – раённымі), гарадскімі і сельскімі саветамі на месцах.

***Сацыялізм*** – паводле марксісцкай тэорыі, першая фаза камунізму, калі дапускаецца сацыяльнае расслаенне грамадства і існаванне іншай, акрамя агульнай, уласнасці на сродкі вытворчасці.

***«Саюзныя рэспублікі»*** – тэрытарыяльна-дзяржаўныя ўтварэнні, якія ствараліся, пачынаючы з канца 1922 г. дзеля забеспячэння бальшавіцка-імперскага кантролю над элітамі і насельніцтвам нярускіх нацыянальнасцяў.

***Сепаратны мір*** – дамова аб міры, заключаная двума бакамі ваеннага канфлікту без згоды трэціх удзельнікаў.

***Стагнацыя*** – эканамічны крызіс.

***Сталінска-бальшавіцкі тэрор*** – сістэма мераў запалохвання і фізічнага вынішчэння насельніцтва Расіі з мэтай выключэння любых праяў крытыкі бальшавікоў за іх няўдачы ў ажыццяўленні сацыяльна-эканамічнай палітыкі, а таксама спынення спробаў ажыўлення іншанацыянальных эліт. Метады гэтага тэрору былі адпрацаваныя падчас «чырвонага тэрору», абвешчанага ў ленінскі час.

***Установчы сход*** – прадстаўнічы орган у Расіі, мэтай дзейнасці якога павінна было стаць вызначэнне дзяржаўнага ладу бу-

дучай Расіі. Яго дэпутаты былі выбраныя падчас усеагульных выбараў 1917 г., ужо пасля захопу ўлады бальшавікамі; тым не менш, апошнія разагналі яго ў студзені 1918 г.

***Харчразвёрстка («продразвёрстка»)*** – сістэма нарыхтовак сельгаспрадуктаў у Савецкай Расіі, якая існавала ў 1919–1921 гг. і палягала ў забеспячэнні прымусовай здачы сялянамі ўсёй вырабленай імі сельгаспрадукцыі па вызначаных бальшавіцкімі чыноўнікамі коштах.

***ЧК*** – руская размоўная абрэвіятура назвы «Надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам». Адпаведны орган быў створаны ў снежні 1917 г. для тэрарызавання насельніцтва, якое з тых або іншых прычын не падпарадкоўвалася бальшавіцкай уладзе. Паклаў пачатак існаванню бальшавіцкіх спецслужбаў, якія пазней функцыянавалі пад назвамі «Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення» (руская размоўная абрэвіятура «ГПУ»), «Народнага камітэта / міністэрства дзяржаўнай бяспекі» («НКГБ», «МГБ»), «Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце міністраў» («КГБ»). Гэтыя структуры дзейнічалі выключна на падставе рашэнняў кіроўных органаў бальшавіцкай партыі і выкарыстоўвалі самыя разнастайныя метады. Уключна з тэрарыстычнымі.

***Халодная вайна*** – тэрмін, якім абазначаецца ідэалагічнае ды палітычнае супрацьстаянне Расіі і дэмакратычных краін Захаду. Сваіх найбольшых маштабаў яна дасягала ў 1946–1985 гг. і пасля 2014 г.

***Чырвоная армія*** – афіцыйная назва ўзброеных сілаў бальшавіцкай дзяржавы, створаных у 1918 г. з ініцыятывы Льва Троцкага, якія з 1946 г. называліся Савецкай арміяй, а ў канцы 1991 г. далі пачатак сучасным Расійскім Узброеным сілам. Мела несумненныя заслугі ў нанясенні паразы гітлераўскай Германіі і вайсковаму рэжыму Японіі ў Другой сусветнай вайне.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


Арутюнов А. А. Ленин. Личностная и политическая биография (Документы, факты, свидетельства). В 2-х тт. Москва: Вече, 2003. 960 с.

Боффа Дж. История Советского Союза. В 2-х томах. Пер. с ит. Москва: Междунар. отношения, 1994. 1264 с.

В Политбюро ЦК КПСС...: По записям Анатолия Черняева, Вадима Медведева, Георгия Шахназарова (1985–1991) / Сост. А. Черняев (рук. проекта), А. Вебер, В. Медведев (Горбачев-Фонд). Москва: Альпина Бизнес Букс, 2006. 784 с.

Великая Отечественная война. Книга потерь / Г. Ф. Кривошеев, В. М. Андроников и др. Москва: Вече, 2009. 384 с.

Вішнеўскі А. Ф. Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917–1953 гг.). Мн.: ТЭСЕЙ, 2002. 224 с.

Геллер М. Я., Некрич А. М. Утопия у власти. Москва: МИК, 2000. 856 с.

Деготь Е. Русское искусство XX века. Москва: Трилистник, 2002. 224 с.

Коряков М. Живая история. 1917–1945. Мюнхен: Echo Press, 1977. 514 с.

Ложь и статистика: как данные об экономике СССР завысили в три раза // Финмаркет. 22.07.2013. *Рэжым доступу*: http://www.finmarket.ru/main/article/3407649.

Лубянка: Органы ВЧК–ОГПУ–НКВД–НКГБ–МГБ–МВД–КГБ / авторы-сост. А. И. Кокурин, Н. В. Петров. Москва: МФД, 2003. 768 с.

Маракоў Л. Ахвяры і карнікі. Мн.: [б. в.], 2007. 440 с.

Мельтюхов М. И. Проэктор Д. М. Блицкриг в Европе, 1939–1941. Польша. Москва: АСТ, Terra Fantastica, 2004. 480 с.

Ратьковский И. Хроника красного террора ВЧК. Карающий меч революции. Москва: Яуза, 2017. 320 с.

СССР – Германия. 1939–1941. Сб. документов / сост. Ю. Фельштинский. Вильнюс: Мокслас, 1989. Ч. 1: 128 с. Ч. 2: 192 с.

Савенко С. И. История русской музыки XX столетия: От Скряби-

на до Шнитке. Москва: Музыка, 2008. 232 с.
Сміт, Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / пер. з англ. Мн.: БФС, 1995. С. 124–157.
Улейчик Н. Л. История культуры России XX века. Гродно: ГрГУ, 2014. 47 с.
Філіпенка У. С. Гісторыя навейшага часу: вуч.-метад. комплекс для студэнтаў. У 2-х ч. Наваполацк: ПДУ, 2012. Ч. 1 – 268 с.; Ч. 2. – 356 с.
Хлевнюк О. В. Хозяин. Сталин и утверждение сталинской диктатуры. Москва: РОССПЭН, 2012. 479 с.
Хоффманн Й. История власовской армии / пер. с нем. Е. Гессен. Париж: YMCA-Press, 1990. 379 с.
Художественная культура. XVIII – начало XXI века: Пособие. Авт.-сост. С. Ю. Лебедев. Мн.: Дизайн ПРО, 2007. С. 222–231, 237–247, 262–268, 288–305, 307–313, 319–326, 357–378.
Fischer, A., Prof. Dr. Sowjetische Außenpolitik 1917–1945. Stuttgart: Klett-Verlag, 1973. 137 S.
Germany and Revolution in Russia 1915–1918. Documents from the Archives of the German Foreign Ministry. Ed. by Z. A. B. Zeman. L., N. Y., Toronto, Oxford University Press, 1958. 158 p.
Hildermeier, M. Geschichte der Sowjetunion. 1917–1991. Entstehung und Niedergang des ersten sozialistischen Staates. 2. überarb. Aufl. München: C. H. Beck, 2017. 1348 S.
Hosking, G. A History of the Soviet Union. 1917–1991. N. Y.: Harpers Collins Publishers 2002. 525 p.
Schlaglichter der Weltgeschichte. In Zusammenarbeit mit Helmut M. Müller u. a. Bonn: Bundeszentrale für politische Bildung, 1992. S. 368–600.
Werth, N. Histoire de l'Union soviétique. De l'Empire russe à la Communauté des États indépendants. (Collection Themis histoire). Paris: Puf, 2008. 576 p.
Werth, N. La Terreur et le désarroi. Staline et son système. (Collection Tempus). Paris: Perrin, 2007. 614 p.

## X. Постсавецкая Расія: эвалюцыя ад фарміравання асноў дэмакратычнага развіцця да спробаў адраджэння імперыі

Расійская Федэрацыя за часоў прэзідэнта Барыса Ельцына. Эканамічны і палітычныя крызісы. Федэратыўная дамова 1992 г. Вайна ў Чачні. Прыход да ўлады стаўленікаў імперскіх сілаў на чале з Уладзімірам Пуціным. Унутраная і знешняя палітыка Расійскай Федэрацыі пры кіраванні тандэма Уладзіміра Пуціна і Дзмітрыя Мядзведзева. Аднаўленне імперскага дыскурсу ў палітыцы Крамля. Крызісныя з'явы ў эканоміцы і духоўным жыцці.

Культура і навука Расіі постсавецкага перыяду.

## Заключэнне. Куды ідзе Расія?

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Алігархія*** – рэжым, пры якім палітычная ўлада ў краіне належыць вузкаму колу асоб. Як правіла, гэтыя асобы з'яўляюцца мільярдэрамі і мультымільянерамі, належаць да вайскова-палітычнай эліты або спецслужбаў і дапамагаюць вызначаным імі палітычным кіраўнікам у забеспячэнні трываласці функцыянавання такога рэжыму.

***Анексія*** – гвалтоўны захоп тэрыторыі чужой краіны або яе часткі.

***Ваўчар*** – каштоўная папера мэтавага прызначэння, якая павінна гарантаваць бясплатную перадачу яе трымальніку часткі былой агульнадзяржаўнай маёмасці.

***Вялікадзяржаўны шавінізм*** – агрэсіўная форма нацыяналізму вялікай сваёй тэрыторыяй і насельніцтвам дзяржавы ў дачыненні да малых дзяржаў.

***Губернатар*** – найвышэйшая службовая асоба рэгіёна-суб'екта сучаснай Расійскай Федэрацыі, якая з 2012 г. зноў выбіраецца насельніцтвам.

***Дзяржаўная дума РФ*** – ніжэйшая палата сучаснага расійскага парламента, у якой засядаюць прадстаўнікі розных палітычных груповак.

***Контррэформы*** – рэформы, скіраваныя на вяртанне да ранейшых парадкаў.

***«Ліберальная імперыя»*** – канцэпцыя ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, у межах якой моцная дэмакратычная дзяржава з рынкавай эканомікай ажыццяўляе экспансію ў іншых дзяржавах з мэтай дасягнення стабільнасці ў зносінах з апошнімі. Грунтуецца на ідэі стварэння «прывабнага вобраза» экспансіянісцкай дзяржавы.

***Прыватызацыя*** – раздзяржаўленне маёмасці, якое праводзіцца з ініцыятывы самой дзяржавы.

***Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі*** – кіраўнік сучаснай Расійскай дзяржавы, якія мае амаль не абмежаваныя паўнамоцтвы ў ажыццяўленні яе ўнутранай і знешняй палітыкі, з’яўляецца вярхоўным галоўнакамандуючым расійскай арміі, валодае правам роспуску Дзярждумы. Пасаду прэзідэнта РФ дагэтуль займалі 3 асобы: Барыс Ельцын, Уладзімір Пуцін і Дзмітрый Мядзведзеў.

***«Рускі мір»*** – паўафіцыйная дактрына ўладаў сучаснай Расійскай Федэрацыі, згодна з якой яны прыўлашчылі права «бараніць інтарэсы рускамоўнага насельніцтва» па ўсім свеце, а асабліва ў постсавецкіх дзяржавах.

***Савет федэрацыі*** – вышэйшая палата сучаснага расійскага парламента, у якой фармальна прадстаўленыя рэгіёны дзяржавы.

***Савет муфціяў*** – адна з цэнтралізаваных арганізацый мусульман сучаснай Расіі, створаная ў 1996 г. на чале з шэйхам Равілем Гайнутдзінам.

***Свяшчэнны сінод рускай праваслаўнай царквы*** – створаны ў 1943 г. пад кантролем бальшавіцкіх кіраўнікоў найвышэйшы орган адпаведнай канфесіі, які ўзначальваецца патры-

ярхам і традыцыйна цесна супрацоўнічае з любой расійскай дзяржаўнай уладай.

***Суд прысяжных*** – суд, вердыкт у якім наконт вінаватасці або невінаватасці абвінавачаных выносяць асобы, якія прынялі адмысловую прысягу.

***Федэральная служба бяспекі (скарочана: ФСБ)*** – орган, афіцыйна пакліканы дзеля «абароны бяспекі Расійскай Федэрацыі» і падпарадкаваны непасрэдна прэзідэнту краіны. Кадравы склад ФСБ сфарміраваўся на аснове супрацоўнікаў былога Камітэта дзяржбяспекі СССР.

***Ценевая эканоміка*** – сістэма вытворчасці, якая існуе насуперак дзейнаму ў краіне заканадаўству.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

Абарин В., Сидорова Г. «Русский мир», бессмысленный и беспощадный. 15.02.2015 // *Рэжым доступу:* https://www.svoboda.org/a/26855650.html.

Аликин А. Экономика России: От спада к стагнации и обратно к спаду? // Иносми.ру. Россия сегодня. 4.05.2017. *Рэжым доступу:* https://inosmi.ru/economic/20170504/239278406.html.

Андреева Е. Ю. Постмодернизм: Искусство второй половины XX – начала XXI века. С.-Петербург: Азбука-классика, 2007. 488 с.

Возрождение российского искусства в конце XX века – начале XXI века: Монография; [под ред. Ю. А. Бревновой]. Новосибирск: Изд-во «СибАК», 2016. 108 с.

Гайдар Е. Т. Дни поражений и побед. Москва: ВАГРИУС, 1996. 365 с.

Зыгарь М. Вся кремлевская рать. Краткая история современной России. 2-е изд. Москва: Альпина-Паблишер, 2018. 408 с.

Короткевич В. И. История современной России. 1991–2003: Учеб. пособие. С.-Петербург: Изд-во Санкт-Петербургского ун-та, 2004. 296 с.

Нагаева Г. История России в формате ЕГЭ. Новейшее время. Ростов-на-Дону: Феникс, 2017. С. 63–69.

Церашковіч П. Глабальныя праблемы чалавецтва: нарысы эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі сучаснасці. Мн.: Зміцер Колас, 2017. 176 с.

Чубайс И. Б. Чубайс против Путина. Чем заменить «вертикаль власти». (Проект «Путин»). Москва: Алгоритм, 2016. 208 с.

Эпоха Ельцина: Очерки политической истории / Батурин Ю. М., Ильин А. Л., Кадацкий В. Ф., Костиков В. В., Краснов М. А. Москва: ВАГРИУС, 2001. 815 с.

Lourie, R. Putin: His Downfall and Russia's Coming Crash. N. Y.: Thomas Dunne Books – St. Martin's Press, 2017. 272 p.

Schröder, Hans Henning, Prof., Dr. Russland unter den Präsidenten Putin und Medwedew, 1999XII2012. (Bundeszentrale für politische Bildung, 6.07.2012) *Рэжым доступу*: https://www.bpb.de/internationales/europa/russland/47926/russland-unter-den-praesidenten-putin-und-medwedew-1999-2012?p=all.

Van Herpen, M. Putin's Propaganda Machine. Lanham, MD – N. Y.: Rowman & Littlefield, 2016. 319 p.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ І ПРЭЗЕНТАЦЫЙ

1. Кіеўская Русь і пазнейшая Расія.
2. Гісторыя дынастыі Рурыкавічаў.
3. Заснаванне Масквы: прычыны і ўмовы.
4. Мангольскія ханы і рускія князі. Залатая Арда і землі Паўночна-Усходняй Русі.
5. Фіна-угры ў гісторыі Расіі.
6. Цюркі і манголы ў гісторыі Расіі.
7. Наўгародская ды Пскоўская рэспублікі і астатняя Русь.
8. Вялікія Смаленскае, Пскоўскае, Разанскае, Цвярское княствы ў гісторыі Расіі.
9. Дойлідства і выяўленчае мастацтва Маскоўскай, Наўгародскай і Пскоўскай Русі.
10. Беларусы ў гісторыі Расіі.
11. Маскоўская дзяржава і ВКЛ у XIII–XVI стст.
12. Маскоўская дзяржава і Рэч Паспалітая ў XVII ст.
13. Расійская імперыя і Рэч Паспалітая ў XVIII ст.
14. Тэрытарыяльная экспансія Маскоўскай дзяржавы ў XV–XIX ст.
15. Працэсы станаўлення Расійскай імперыі.
16. Еўрапеізацыя высокай культуры ў Маскоўскай дзяржаве і Расійскай імперыі.
17. Скамарохі і карнавальная культура сярэднявечча і ранняга Новага часу.
18. Асоба і месца ў гісторыі Пятра Першага.
19. Асоба і месца ў гісторыі Кацярыны Другой.
20. Кацярына Другая і падзелы Рэчы Паспалітай.
21. Імперская палітыка Расіі ў XIX – пачатку XX стст.
22. Прычыны хранічнай адсталасці расійскай эканомікі ў працэсе гістарычнага развіцця Маскоўскай дзяржавы і Расійскай імперыі.
23. Расія ў эпоху рэвалюцый (1905–1917 гг.).

24. Асоба і месца ў гісторыі Уладзіміра Леніна.
25. Асоба і месца ў гісторыі Льва Троцкага.
26. Асоба і месца ў гісторыі Іосіфа Сталіна.
27. Усталяванне і развіццё савецкай імперыі ў выглядзе СССР.
28. Рэальныя і выдуманыя поспехі расійскай эканомікі ў савецкі перыяд.
29. Расійская навука на службе ў савецкіх правадыроў.
30. Карані і асаблівасці бальшавіцкага тэрору (1918–1941 гг.).
31. Позняст алінскі тэрор пасля Другой сусветнай вайны.
32. Пакт Молатава–Рыбентропа і яго наступствы для свету.
33. Бальшавіцкае кіраўніцтва і народы СССР падчас Другой сусветнай вайны.
34. Прычына і наступствы хрушчоўскай «адлігі».
35. Эпоха «застою» ў савецкай імперыі.
36. Дысідэнцкі рух у розных частках савецкай імперыі.
37. Праблемы развіцця культуры ў Савецкім Саюзе.
38. Асоба і месца ў гісторыі Міхаіла Гарбачова.
39. Асоба і месца ў гісторыі Барыса Ельцына.
40. Пуцінская Расія: развіццё і яе далейшыя перспектывы.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Культурная геаграфія

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Павел Церашковіч,*
кандыдат гістарычных навук

# УСТУП

Культурная геаграфія – гэта навуковая дысцыпліна, якая даследуе ўзаемадзеянне разнастайных формаў і вынікаў чалавечай дзейнасці і геаграфічнай прасторы. Яе можна прадставіць як форму спалучэння ведаў, з аднаго боку, геаграфіі фізічнай, з другога – культурнай антрапалогіі, этналогіі, культуралогіі, рэлігіязнаўства.

Вытокі культурнай геаграфіі часта звязваюць з Фрыдрыхам Ратцэлем, аўтарам вядомай працы «Антрапагеаграфія» (1882), якога ў роўнай ступені лічаць і географам і антрапалагам (этнолагам). Менавіта ён распрацаваў паняцце ландшафту як месца ўзаемадзеяння чалавека і прыроднага асяроддзя. У 1920–1930-х гг. лідарам культурнай геаграфіі стаў прафесар універсітэта ў Бёрклі (ЗША) Карл Заўэр, які даследаваў якім чынам людзі ствараюць культурны ландшафт і як ландшафт, са свайго боку, уплывае на паводзіны і культуру народаў. Падобныя сюжэты ў той жа час вывучаў рускі этнограф, стваральнік канцэпцыі этнасу Сяргей Шыракагораў.

Развіццё новых кірункаў сацыяльнай тэорыі ў заходняй інтэлектуальнай прасторы (пост-каланіяльных даследаванняў, пост-мадэрнізму і пост-структуралізму) прывяло да ўзмацнення ўласна гуманітарнага пачатку і ўтварэння ў 1980-х гг. так званай «новай культурнай геаграфіі». У сваіх метадах інтэрпрэтацыі культуры яна зноў наблізіўся да культурнай і сацыяльнай антрапалогіі. Ландшафт яе прадстаўнікамі разглядаўся не як простае адлюстраванне культуры, а ў якасці аб’екта, які меў сімвалічнае значэнне, сэнс якога неабходна разумець у сацыяльным і гістарычным кантэксце. Даследаванні будаваліся з фокусам на культурнай палітыцы разнастайных сацыяльных груп. «Культурны паварот» у культурнай геаграфіі прыцягнуў увагу да праблем рэпрэзентацыі культуры ў сродках масавай інфармацыі, мастацтве, культурнай

спадчыне, модзе, харчаванні і г. д. Пры гэтым узмацнілася ўзаемадзеянне з такімі традыцыйнымі галінамі геаграфічных ведаў, як эканамічная і палітычная геаграфія. Лічыцца, што на сённяшні дзень культурная геаграфія з'яўляецца адным з найбольш дынамічных і перспектыўных напрамкаў сацыяльнай геаграфіі.

У Беларусі, на жаль, культурная геаграфія яшчэ не склалася ў якасці цэласнай з'явы. Ёсць толькі некалькі асобных публікацый якіх з пэўнай доляй ўмоўнасці можна аднесці да гэтага напрамку. Сярод іх вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Геаграфія культуры Беларусі», створаная выкладчыкам Магілёўскага універсітэта Ігарам Шарухам, а таксама працы вядома беларускага этнографа Віктара Цітова, якія шмат у чым закранаюць праблематыку культурнай геаграфіі, у тым ліку ўтварэнне культурнага ландшафту. Аднак усе гэтыя спробы абмежаваныя тэрыторыяй Беларусі.

Існуе вялікая патрэба ва ўласна беларускім асэнсаванні культурнай геаграфіі ў глабальным кантэксце. Гэта датычыць не толькі ўласна сферы даследаванняў, але і выкладання геаграфіі ў школе. Звесткі аб культурнай разнастайнасці чалавецтва, якія дае школьны курс, фрагментарныя, заснаваныя на састарэлых тэарэтычных схемах і часта папросту недаравальна памылковыя. Яны па сваім аб'ёме значна саступаюць фізікагеаграфічнай і эканамічнай інфармацыі; не звязаныя з ёй лагічнымі сувязямі. А між тым, геаграфія – фактычна адзіны школьны прадмет які можа і павінен фарміраваць адэкватныя ўяўленні аб адзінстве і культурнай разнастайнасці чалавецтва. Ва ўмовах няспыннага паглыблення глабалізацыі, павелічэння міжнацыянальных кантактаў і ўзаемадзеяння патрэбнасць у іх будзе толькі павялічвацца.

Сучасная практыка выкладання культурнай геаграфіі ў свеце не мае нейкага канону, дакладнай ці нават прыблізнай схемы зместу дыдактычнага матэрыялу. Кожны аўтар прапаноўвае

ўласнае бачанне, заснаванае, хутчэй, на аналізу канкрэтных даследчыцкіх праектаў, чым на генералізацыі ведаў. Праграма, што падаецца ніжэй, з’яўляецца прыкладам культурна-антрапалагічнага бачання культурнай геаграфіі, адаптаванага для вывучэння вучнямі старэйшых класаў гімназій і ліцэяў.

## МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Мэта вучэбнага курса «Культурная геаграфія» – умацаванне і сістэматызацыя базавых ведаў і ўяўленняў аб адзінстве і культурнай разнастайнасці чалавецтва ў геаграфічнай перспектыве ў навучэнцаў гуманітарнага ліцэя. Чалавецтва і культура разглядаюцца як сукупнасць сацыяльных інстытутаў, якія падаюцца ў крос-культурным, эвалюцыйным і прасторавым кантэкстах. Дысцыпліна дапаўняе асноўны змест вывучэння геаграфіі на IV курсе ліцэя (11 клас) і мае на мэце пашырэнне сферы разумення сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным глабалізаваным грамадстве.

Дысцыпліна дае абагульненыя веды аб найбольш істотных тэндэнцыях развіцця і геаграфічнага размеркавання лінгвістычнай і расавай разнастайнасці, стратэгій жыццезабеспячэння, арганізацыі эканамічных адносінаў, сацыяльнай стратыфікацыі, спосабаў падтрымання сацыяльнага кантролю ў грамадстве, традыцыйных формах палітычнай арганізацыі і паходжання дзяржаўнай ўлады, шлюбна-сямейных стасункаў і сістэм сваяцтва, рэлігійнага жыцця і г. д.

Асаблівасцю курса з’яўляецца разгляд універсальных інстытутаў існавання чалавецтва з улікам ролі і месца ў іх традыцыйнай культуры беларусаў.

Для паспяховага засваення курса навучэнцы павінны валодаць катэгарыяльным апаратам, засвоеным у працэсе вывучэння агульнай геаграфіі краін і мацерыкоў, у тым ліку ведаў

аб матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету, сусветных рэлігіях і г. д. у памеры школьнай праграмы.

У выніку вывучэння курса «Культурная геаграфія» навучэнцы павінны засвоіць наступныя веды і навыкі:

- ведаць і ўмець карыстацца аперацыйным разуменнем паняцця культура ў межах культурнай геаграфіі;
- разумець сутнасць паняцця культурны ландшафт як формы і выніку ўзаемадзеяння чалавека і прыроднага асяроддзя;
- ведаць структуру, асноўныя кампаненты і геаграфічнае размеркаванне моўных сем'яў;
- ведаць праявы і геаграфію расавай разнастайнасці чалавецтва;
- ведаць сутнасць, эвалюцыю і геаграфічнае размеркаванне асноўных стратэгій жыццезабеспячэння;
- разумець найбольш істотныя формы эвалюцыйнай і геаграфічнай разнастайнасці арганізацыі кантролю над рэсурсамі, вытворчасці, абмену і размеркавання;
- ведаць асноўныя формы сацыяльнай і гендарнай стратыфікацыі;
- разумець функцыі асноўных форм сацыяльнага кантролю, яго лакальна-геаграфічныя асаблівасці ў розных рэгіёнах свету;
- ведаць паходжанне і гістарычныя формы палітычнай арганізацыі, яе геаграфічныя асаблівасці;
- разумець функцыі і формы культурнай зменлівасці шлюбу, сям'і і сістэм сваяцтва;
- ведаць функцыі, гістарычныя формы арганізацыі рэлігійных культаў у геаграфічнай перспектыве;

Структура курса заснаваная як на тыповых падыходах цэласнага вывучэння геаграфіі свету, так і напрацоўках іншых дысцыплін: культурнай антрапалогіі, этналогіі, этнаграфіі, гісторыі, сацыялогіі, рэлігіязнаўства і г. д.

На працягу курса вучням будуць прапанаваны наступныя віды самастойных работ: напісанне эсэ, выступленне з прэзентацыяй, выкананне тэстаў, удзел у дыскусіях.

Паказчыкамі засваення матэрыялаў курса будзе дэманстрацыя валодання катэгарыяльным апаратам культурнай геаграфіі, здольнасць да арыентацыі ў прасторы (на карце), здольнасць праводзіць параўнальны аналіз і рабіць абгрунтаваныя высновы.

## ЗМЕСТ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

### Тэма 1. Разуменне паняцця культуры ў культурнай геаграфіі і антрапалогіі.

Антрапалагічны падыход да культуры. Вызначэнне культуры. Складовыя часткі культуры: матэрыяльныя аб'екты, мадэлі паводзінаў, ідэі і каштоўнасці.

Культура як форма адаптацыі да асяроддзя. Культурны ландшафт, яго прагматычнае і сімвалічнае значэнне.

Культура як форма умацавання групавой салідарнасці. Культура як вынік навучання. Культура і біялогія чалавека. Успрыманне культурнай і біялагічнай разнастайнасці. Універсальныя кампаненты культуры.

Асноўныя метадалагічныя прынцыпы: універсалізм, халізм, культурны рэлятывізм, інтэгратыўнасць, адаптыўнасць.

### Тэма 2. Лінгвістычная разнастайнасць чалавецтва ў геаграфічным вымярэнні.

Асноўныя катэгорыі вымярэння лінгвістычнай разнастайнасці. Моўныя сем'і і групы.

Індаеўрапейская моўная сям'я. Германскія, раманскія, славянскія, індыйскія і іранскія мовы. Малыя групы індаеўрапей-

скіх моў: кельцкая, балтыйская, грэцкая, албанская, армянская. Месца беларускай мовы ў індаеўрапейскай сям'і.

Алтайская моўная сям'я. Цюркскія і мангольскія мовы.

Уральская моўная сям'я. Фіна-ўгорская група.

Афра-азійская моўная сям'я. Сяміцкія мовы.

Каўказская моўная сям'я.

Сіна-тыбецкая моўная сям'я. Кітайская мова і яе дыялекты.

Моўная сітуацыя ў Афрыцы.

## Тэма 3. Расавая разнастайнасць чалавецтва ў геаграфічнай перспектыве.

Расавыя прыкметы. Вялікія расы і малыя расавыя тыпы.

Вялікая негроідная раса і яе расавыя тыпы.

Вялікая мангалоідная раса і яе расавыя тыпы.

Вялікая еўрапеоідная раса і яе расавыя тыпы.

Пераходныя расавыя тыпы.

Ізаляваныя расавыя тыпы: айны, палінезійцы.

## Тэма 4. Стратэгіі жыццезабеспячэння.

Навакольнае асяроддзе і тэхналогія. Гістарычныя тыпы здабывання ежы.

Спажывальныя стратэгіі. Паляванне і збіральніцтва: агульная характарыстыка. Конныя і водныя паляўнічыя і збіральнікі.

Вытворчыя стратэгіі. Неалітычная рэвалюцыя: сацыяльныя і культурныя наступствы. Ручное земляробства (хорцікультура). Пастаралізм: намадызм, трансхуманцыя.

Ворыўнае земляробства (агракультура). Тэхналогіі. Сацыяльныя наступствы пераходу да ворыўнага земляробства. Цывілізацыі.

Індустрыялізаваныя спосабы вытворчасці прадуктаў харчавання. Сацыяльныя наступствы перахода да індустрыялізаванай вытворчасці харчавання.

## Тэма 5. Геаграфія традыцыйных формаў эканамічнай актыўнасці чалавецтва.

Прыродныя рэсурсы. Гістарычныя формы кантролю на рэсурсамі.

Вытворчасць. Культурныя і прыродныя фактары спецыфікі вытворчай дзейнасці. Формы арганізацыі вытворчасці. А. Чаянаў і яго канцэпцыя функцыянавання сялянскай гаспадаркі.

Падзел працы. Пола-ўзроставы і спецыялізаваны падзел працы.

Размеркаванне. Абмен і яго гістарычныя тыпы. Пераразмеркаванне. Збор даніны, падаткаў, «біг мэн», «потлач», Рынкавы абмен.

## Тэма 6. Геаграфія і эвалюцыя форм сацыяльнай стратыфікацыі.

Крытэрыі вымярэння сацыяльнай няроўнасці. Багацце. Улада. Прэстыж.

Гістарычныя формы сацыяльнай стратыфікацыі.

Эгалітарныя грамадствы.

Рангавыя грамадствы.

Стратыфікаваныя грамадствы. Каставыя сістэмы. Класавыя грамадствы.

Гендарная стратыфікацыя.

## Тэма 7. Геаграфія традыцыйных палітычных сістэм.

Крытэрыі ступені развіцця палітычнай арганізацыі. Ступень выяўленасці палітычных структур. Улада. Палітычная інтэграцыя.

Гістарычныя тыпы палітычнай арганізацыі.

Ацэфальныя грамадствы.

Абшчыны. Плямёны.

Правадырства.

Дзяржавы. Базавыя прыкметы дзяржавы. Канцэпцыі паходжання дзяржаў.

## Тэма 8. Геаграфія традыцыйных формаў сацыяльнага кантролю.

Сацыяльныя нормы. Пазітыўныя і негатыўныя санкцыі.

Нефармальныя сродкі сацыяльнага кантролю. Сацыялізацыя. Грамадская думка. Групавы сваяцкі кантроль. Сістэма ўяўленняў пра звышнатуральны кантроль.

Фармальныя сродкі сацыяльнага кантролю. Інстытут пасярэднікаў. Рады старэйшын. Ардаліі. Прысягі. Суды і кадыфікаванае права.

## Тэма 9. Геаграфія традыцыйных форм шлюбу і сямейных адносінаў.

Вызначэнне шлюбу і сям'і. Базавыя характарыстыкі. Функцыі шлюбу і сям'і.

Правіла заключэння шлюбаў. Універсальнае табу інцэсту. Экзагамія і эндагамія.

Класіфікацыйныя формы шлюбных саюзаў: крос-кузенны шлюб, сарарат, левірат.

Эканамічныя аспекты заключэння шлюбу. Калым. Адпрацоўкі за нявесту. Пасаг. Абмен жанчынамі. Маёмасны ўзаемаабмен.

Сям'я. Колькасць сужэнцаў.

Манагамія.

Палігінія.

Паліандрыя.

Тыпы сям`і па лакалізацыі жыхарства.

Тыпы структуры сем'яў. Вялікая сям'я. Нуклеарная сям'я.

## Тэма 10. Геаграфія традыцыйных форм сваяцтва.

Вызначэнне сваяцтва. Функцыі сваяцтва. Графічныя дыяграмы сваяцтва.

Прынцыпы класіфікацыі сваяцтва.

Сваяцкія групы.

Унілінейныя групы. Патрылінейныя групы. Матрылінейныя групы. Лініджы. Кланы. Фратрыі. Паловы.

Білінейныя сваяцкія групы.

Кагнатыўныя сваяцкія групы.

Асноўныя сістэмы сваяцтва: эскімоская, гавайская, іракезская, амаха, кро, суданская.

## Тэма 11. Геаграфія традыцыйных формаў рэлігійнага жыцця.

Вызначэнне рэлігіі. Рэлігія і магія.

Сацыяльныя функцыі рэлігіі. Сацыяльны кантроль. Прадухіленне канфліктаў. Узмацненне групавой салідарнасці.

Псіхалагічныя функцыі рэлігіі. Кагнітыўная функцыя. Эмацыйная функцыя.

Гістарычныя формы арганізацыі рэлігійнага жыцця. Індывідуалістычныя культы.

Шаманісцкія культы. Абшчынныя культы. Эклезіястычныя культы.

Рэлігія і сацыяльная трансфармацыя. Рэвіталісцкія культы.

## ЛІТАРАТУРА ДА ЎСІХ ТЭМ

Арутюнов С. А., Рыжакова С. И. Культурная антропология. Москва: Весь мир, 2004. 216 с.

Бенедикт Р. Хризантема и меч. Пер. с англ. Москва: РОССПЭН, 2004. 256 с.

Геаграфія культуры Беларусі. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў. *Рэжым доступу:* www.adu.by/images/2016/07/fz-geo-kult-bel-10kl.doc

Геннеп А. Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов. Пер. с франц. Москва: Изд. фирма «Восточная литература» РАН, 1999. 198 с.

Гирц К. Интерпретация культур. Пер. с англ. Москва: РОССПЭН, 2004. 560 с.

Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. Пер. з англ. Навук. рэд. П. Церашковіч. Мн.: Тэхналёгія – БФС, 1995. 478 с.

Дуглас М. Чистота и опасность. Пер. с англ. Москва: Канон-пресс-Ц, Кучково поле, 2000. 288 с.

Леви-Брюль Л. Сверхъестественное в первобытном мышлении. Пер. с франц. Москва: Педагогика-пресс, 1994. 608 с.

Леви-Стросс К. Структурная антропология. Пер. с франц. Москва: ЭКСМО-Пресс, 2001. 512 с.

Леви-Стросс К. Печальные тропики. Пер. с франц. Москва: Neoclassic, АСТ, Астрель, 2010. 448 с.

Малиновский Б. Избранное: динамика культуры. Пер. с англ. Москва: ЦГИ, 2015. 464 с.

Малиновский Б. Избранное: Аргонавты западной части Тихого океана. Пер. с англ. Москва: ЦГИ, 2015. 560 с.

Мид М. Культура и мир детства. Пер. с англ. Москва: Наука, 1988. 429 с.

Митин И. И. Культурная география в СССР и постсоветской России. *Рэжым доступу:* http://gumgeo.ru/public/files/MitinMJIK.pdf

Морган Л. Г. Лига ходеносауни, или ирокезов. Пер. с англ. Москва: 1983. 301 с.

Мос М. Общества. Обмен. Личность: Труды по социальной антропологии. Пер. с франц. Москва: КДУ, 2011. 416 с.

Мос М. Техники тела (пер. с франц.) // Человек. 1993, № 2. С. 64–79.

Рагулина М. В. Культурная география: теории, методы, региональный синтез. Дисс. … д-ра геогр. н. Иркутск, 2005. 341 с.

Рэдклиф-Браун А. Р. Метод социальной антропологии. Пер. с англ. Москва: Канон-пресс-Ц, Кучково поле, 2001. 416 с.

Сервье Ж. Этнология. Пер. с франц. Москва: АСТ, 2004. 160 с.

Тайлор Э. Б. Первобытная культура. Пер. с англ. Москва: Политиздат, 1989. 573 с.

Уайт Л. Избранное: эволюция культуры. Пер. с англ. Москва: РОССПЭН, 2004. 1064 с.

Фрезер Д. Д. Золотая ветвь. Пер. с англ. Москва: Политиздат, 1986. 704 с.

Цітоў В. С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. Мн.: Навука і тэхніка, 1994. 300 с.

Цітоў В. С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. Мн.: Беларусь, 2001. 207 с.

Эванс-Причард Э. Э. Нуэры. Описание способов жизнеобеспечения и политических институтов одного из нилотских народов. Пер. с англ. Москва: Наука, 1985. 243 с.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве / аўт.: Навагродскі Т. А., Махоўская І. С., Валодзіна Т. В., Церашковіч П. У. і інш. Мн.: БДУ, 2009. 335 с.

# ЗМЕСТ

Аўтарская праграма вывучэння курса
«Літаратура і мастацтва» .......... 5
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Гісторыя Расіі ад пачаткаў да сённяшніх дзён» .......... 27
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Культурная геаграфія» .......... 79

Даведачнае выданне

**Літаратура і мастацтва**
**Сусветная гісторыя**
**Геаграфія**

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы*
*гуманітарнага ліцэя*

Для ўнутранага карыстання
ў грамадскай арганізацыі

Падпісана да друку 21.05.2018. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 3,18. Ум. друк. арк. 5,35.
Наклад 99 асобнікаў.

Надрукавана на офісным абсталяванні
Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
«Таварыства беларускай школы»